Этой страницей мы соединили два документа – американский и белорусский. Два мировоззрения, которые несоединяемы, ибо первое предполагает жизнь и процветание, а второе – разложение.

Наконец мы узнали, что такое "рыночный социализм". Это базарная торговля конституционными постулатами, это прихватизация конституционных статей.

Послание президента непостижимым образом соединило его характер, его лексику и казуистику титулованных юристов, окружающих президента.

Нет ничего страшнее юридической казуистики, размывающей критерии, переворачивающей мироздание с ног на голову, сбивающей с толку здравый ум. С ее помощью можно сделать все: заболтать референдум и провозгласить новый, сделать нелегитимным легитимный парламент, разделить законы на плохие и хорошие, дать по спине депутатам, разнести Конституцию по ведомственным углам, опошлить принципы правового государства, убить в народе первые ростки правосознания.

В Америке за 200 лет принято всего 27 поправок к Конституции, в Беларуси через 2 года предлагают Конституцию переписать заново.

Можно с грустью констатировать: предложив кардинальную перекройку Конституции, президент по сути ликвидировал ее как явление жизни. В сознании наших людей все предыдущие (сталинские и брежневские) конституции и так ассоциировались с враньем, с кремлевским маразмом, с гулаговским стоном, с куропатскими рвами. Новая, лукашенковская, конституция будет восприниматься людьми фиговым листком, прикрывающим неуемное стремление президента к абсолютной ("легитимной", "конституционной") власти.

Как отметил в своей смелой публикации по поводу Послания президента судья КС, доктор юридических наук М. Пастухов, в документе "отчетливо просматривается стремление исполнительной власти осуществить новый передел власти. Предлагается совершенно надуманная теория о правовых законах".

Читатель, возможно, подумал: лукашенковской конституции еще нет, а есть Конституция Республики Беларусь, принятая Верховным Советом, цивилизованная, отвечающая всем нормам мирового права, -- и не надо паники, надо вступать в "Общественное движение в защиту Конституции", созданное недавно, противостоять прихватизаторам Конституции всем миром. Эх, дорогой читатель, будто ты за два года не убедился: наш президент если что задумал – сделает. Так что будет у нас лукашенковская конституция, для этого А.Г. перевернет мир, а в гробу – Сталина.

Умение перевертывать с блеском продемонстрировано в ответе президента Конституционному суду. Не согласившись с аргументированным выводом КС об отсутствии в нашей республике прав и свобод человека, без краски стыда заявив, "что все политические права и свободы у нас в стране обеспечиваются в полной мере", президент с краской праведного гнева застучал кулаком по столу в адрес тех, кто сталкивает его с необратимого пути "демократического развития, многопартийности, свободы слова, всех других гражданских прав и свобод", с которого, с пути, столкнуть его "мы не допустим".

Каков финт!

И все-таки, на наш взгляд, имеется возможность констатировать по всему этому грустному поводу маленькую надежду: президент – озабочен. Не зря он ополчился на КС главным образом за права и свободы, не зря бьет себя в грудь, что права и свободы есть. Мир-то знает, что оных в Беларуси – нет. А.Г. озабочен личным имиджем.

Вот в эту брешь в стене и сочитесь все, кто желает жить по Конституции во имя своего спасения.

ДЗЕКАБРЫСТ МІХАІЛ ЛУНІН АДНОЙЧЫ АФАРЫСТЫЧНА ЗАЎВАЖЫЎ, ШТО Ў РАСІІ ДВА ПРАВАДНІКІ: ЯЗЫК ДА КІЕВА, А ПЯРО – ДА ШЛІСЕЛЬБУРГА. МАГЧЫМА, БЕЛАРУСКІ ШЛЯХЦІЧ АЛЯКСАНДР НЕЗАБЫТОЎСКІ ГЭТЫХ СЛОЎ І НЕ ВЕДАЎ, АЛЕ ІХ СПРАВЯДЛІВАСЦЬ ПАЦВЕРДЗІЎ СВАІМ ТРАГІЧНЫМ ЛЁСАМ. ТУРМА Ў ВІЛЕНСКІХ ДАМІНІКАНСКІХ МУРАХ МАЛА ЧЫМ РОЗНІЛАСЯ АД ШЛІСЕЛЬБУРГСКІХ КАЗЕМАТАЎ. А ТРАПІЎ У АДЗІНОЧНУЮ КАМЕРУ НЕЗАБЫТОЎСКІ ВЫКЛЮЧНА ЗА СВАЕ ТВОРЫ.

ЗА ІХ МАЛАДЫ ПІСЬМЕННІК, ФІЛОСАФ І ГІСТОРЫК АТРЫМАЎ НЕВЕРАГОДНА ЦЯЖКІ ПРЫСУД: ПАСЛЯ ПАЗБАЎЛЕННЯ ДВАРАНСКАЙ ГОДНАСЦІ (КАТ ПАВІНЕН БЫЎ ЗЛАМАЦЬ НАД ЯГОНАЙ ГАЛАВОЙ ШПАГУ) І МАЁМАСНЫХ ПРАВОЎ АЎТАРА КРАМОЛЬНЫХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЧАКАЛА ДВАЦЦАЦІГАДОВАЯ КАТАРГА Ў СІБІРСКІХ РУДНІКАХ. ТАК У ІМПЕРЫІ СУДЗІЛІ ТОЛЬКІ САМЫХ НЕБЯСПЕЧНЫХ ДЗЯРЖАЎНЫХ ЗЛАЧЫНЦАЎ -- УДЗЕЛЬНІКАЎ СНЕЖАНЬСКАГА ПАЎСТАННЯ НА СЕНАЦКІМ ПЛЯЦЫ І ПЕТРАШЭЎЦАЎ.

Уладзімір АРЛОЎ

ВЯЗЕНЬ КАМЕРЫ № 13

У адну з кароткіх ліпеньскіх начэй 1847 года на мяжы Аўстра-Венгрыі і Расіі, каля мястэчка Радзівілава, мясцовы прыстаў перахапіў фурманку з трыма мяхамі кантрабанды. Гэтым разам, апрача звычайных тавараў, царскія служакі знайшлі нешта больш істотнае: "пераплеценых кніг на замежных мовах – 11, без пераплёту – 36, розных рукапісных сшыткаў -- 65, лістоў -- 346..." У дакументах і рукапісах раз-пораз сустракалася прозвішча Незабытоўскі.

Неадкладна быў падпісаны загад аб арышце памешчыка Мінскай губерні Аляксандра Хрыстафоравіча Незабытоўскага, які напярэдадні перасёк мяжу, вяртаючыся з трохгадовага падарожжа па Заходняй Еўропе і Міжземнамор'і ў свой маёнтак Смалічы пад Нясвіжам.

Справаю ўладальніка кантрабандных кніг і рукапісаў заняўся сам галоўнакамандуючы арміі генерал-фельдмаршал Паскевіч. З ягонай канцылярыі выходзіць адрасаваны віленскаму генерал-губернатару ліст аб тым, што "затрыманыя паперы выкрываюць Незабытоўскага ў наступных злачынствах: 1. У зняваге гасудара імператара і іншых высокіх асобаў самымі нізкімі і дзікімі лаянкамі. 2. У лютай нянавісці супроць ураду. 3. У пошуках сродкаў для знішчэння цяперашняга ладу ў Расіі. 4. У напісанні заклікаў з мэтаю ўзбунтаваць заходнія правінцыі і адарваць іх ад Расійскай імперыі, etc".

Далей у гэтай рэляцыі (яе адшукаў у архівах літаратуразнаўца С.Х. Александровіч) ішоў загад перадаць справу ў Віленскую следчую камісію, якая займалася палітычнымі злачынцамі. Так Незабытоўскі апынуўся ў адзіночнай камеры № 13 колішняга дамініканскага кляштара, у тых самых мурах, дзе калісьці сядзелі філаматы і філарэты Адам Міцкевіч, Тамаш Зан і Ян Чачот, а пазней – паўстанец 1830 года Сымон Канарскі і беларускі паэт-дэмакрат Францішак Савіч. Вырвацца адсюль на волю шчасціла нямногім: Канарскага расстралялі, Савіча выслалі салдатам на Каўказ...

■

Наглядчыкам і канваірам забаранілі размаўляць з вязнем. Пра чалавеку з трынаццатай камеры яны, па чутках, ведалі толькі тое, што ён напісаў нейкія крамольныя кнігі. Гэта была праўда: пяру Незабытоўскага належыла сем ананімна выдадзеных у Вільні і Парыжы кніг. Асобае месца сярод іх займалі надрукаваныя ў Францыі мемуары пра нацыянальна-вызваленчае паўстанне 1830—1831 гадоў і раман-утопія "Мары пра каханне, славу і свабоду". Менавіта за іх аўтару было наканавана атрымаць у якасці "ганарара" дваццаць гадоў катаргі.

На пачатку следства вёў штабс-капітан Мілер. Каб выклікаць вязня на шчырасць, ён расказваў на допытах пра свае поспехі ў жанчын, а потым, пускаючы блакітныя кольцы дыму ад дарагой цыгары, заводзіў гаворку пра тое, як ён перажывае, што выхаванец Дэрпцкага ўніверсітэта, адзін з самых багатых памешчыкаў свайго павета, бавіць час у сырой халоднай камеры. Грубая ежа, нямытае адзенне, насякомыя... Нават толькі дзеля захавання чалавечае годнасці ён, следчы, на месцы свайго візаві зрабіў бы ўсё магчымае, каб аблегчыць свой лёс. Ужо адно прызнанне віны...

Але Незабытоўскі са штабс-капітанам мелі розныя ўяўленні пра чалавечую годнасць і спосабы яе захавання. Перамогі над віленскімі дамамі відавочна даваліся Мілеру лягчэй, чым над палітычнымі злачынцамі, і неўзабаве святлейшы князь Варшаўскі Паскевіч асабіста прызначыў новага следчага.

■

Пратэжэ генерал-фельдмаршала стацкі саветнік Явецкі лічыў, што яму пашанцавала. Не трэба было мець вялікага таленту, каб здагадацца параўнаць почыркі ў прашэнні Незабытоўскага аб паездцы за мяжу і ў захопленых жандармамі рукапісах. Апрача таго, у мемуарах ён імкнуўся быць праўдзівым, і следству было вельмі проста суаднесці ананімныя ўспаміны з жыццём нясвіжскага памешчыка. Явецкаму мроілася, што не сёння дык заўтра ён пачуе поўнае прызнанне і будзе трыумфатарам. Сапраўды, ягоныя доказы немагчыма было абвергнуць.

Але іх можна было не прызнаваць.

Якраз такую тактыку і абраў пісьменнік і філосаф, які калісьці ў юнацтве за адну бяссонную ноч склаў параўнальны жыццяпіс Напалеона і Аляксандра Македонскага, які прагнуў славы і ўтаймоўваў гэтую прагу, не ставячы на сваіх кнігах свайго імя, які паслядоўна называў сябе літвінам і лічыў, што не мае права ні дня быць шчаслівым, пакуль няшчасная Айчына.

Незабытоўскі вырашыў зрабіць усё, каб яго справа не стала на кар'ерным шляху Явецкага прыступкаю ўгору – ад стацкага саветніка да сапраўднага стацкага, ад ордэна св. Ганны з каронай да св. Уладзіміра.

На адным з допытаў падследны паведамляе, што "любіць чытаць кнігі, але аўтарствам ніколі не займаўся". Ужо не верачы ў магчымасць вырваць прызнанне, Явецкі патрабуе ў Вільню сведкаў з нясвіжскага маёнтка і ваколіцаў -- аканома, арандатараў, слугаў. Лаканічны рапарт у вышэйшыя інстанцыі кажа пра многае: "З прычыны незвычайнай упартасці арыштаванага ў прызнанні нават відавочнай ісціны камісія прызнала непатрэбным даваць яму вочныя стаўкі".

Раз'ятраны следчы сам едзе ў Смалічы і ўласнаручна перятрасае маёнтак палітычнага злачынцы. Дзесьці ў спальні знойдзены галоўны трафей – аркушык са зместам напісанага па-французску і выдадзенага ў 1845 годзе ў французскай сталіцы рамана "Мары пра каханне, славу і свабоду".

■

Пасля вяртання Явецкага паміж ім і зняволеным адбываецца прыкладна наступная размова:

--Ну-с, пане Незабытоўскі, я толькі што скончыў чытаць адзін надзіва займальны раман, прысвечаны марам пра каханне і іншыя прыемныя рэчы...

--Мне заўсёды цікава пагаварыць з чалавекам, які чытае кнігі.

--А яшчэ цікавей звесці знаёмства з чалавекам, які іх піша, ці не так?

--Каго пан следчы мае на ўвазе?

--У вашай нездагадлівасці сапраўды няма межаў. Але вернемся да справы. У нас цяпер 1848 год. Такім чынам да прадказанай вамі рэвалюцыі застаюцца лічаныя гады, калі не месяцы.

--Аб якім прадказанні, пане следчы, ідзе гаворка? Мяне ніколі не вабіла роля аракула.

--Аб вашым, пане Незабытоўскі. Я кажу аб прароцтве, якое вы робіце ў сваім рамане.

--Але я ніколі не пісаў раманаў. Нават лісты да сяброў даюцца мне з цяжкасцю.

--Тым не менш почырк рукапісу (Явецкі ківае на дзве пульхныя папкі на стале) супадае з почыркам вашага дзённіка.

--На жаль, пана следчага ўвялі ў зман. У мяне няма звычкі заводзіць дзённікі.

--Цудоўна, цудоўна... А што вы скажаце наконт гэтай паперкі? Між іншым, на ёй пералічваюцца назвы раздзелаў памянёнага рамана. І, між іншым, яе я знайшоў у вашай спальні. У следчай практыцы гэта называецца рэчавым доказам.

--Вы ўжо дабраліся да маёй спальні? Віншую... Значыцца, на думку пана следчага, я склаў змест невядомага мне рамана. Выбачайце, але гэта пярэчыць логіцы.

--Тады як вы растлумачыце з'яўленне паперкі ў вашым маёнтку?

--Пан следчы ж лётаў нечага такімі маразамі за дзвесце вёрст у мае Смалічы.

Явецкі блізкі да шаленства, аднак допыт яшчэ не скончаны і ініцыятыва ў ім канчаткова пераходзіць да падследнага.

--Яшчэ раз перапрашаю, пане следчы, але раман, аб якім вы гаворыце, заняў у размове такое вялікае месца, што я насмелюся прасіць вас хаця б у двух словах акрэсліць яго сюжэт і ідэю.

--З вялікай прыемнасцю, пане падследны. У рамане апісваецца жыццё ў заходніх губернях пасля перамогі нейкай, з дазволу сказаць, народнай рэвалюцыі. Вядомы вам, напэўна, сэр Томас Мор мусіць недзе там, на Парнасе, пасунуцца, каб даць месца новай утопіі. Толькі яго фантазія, на вялікі жаль, скіраваная не на ўдасканаленне жыцця дзяржавы, а на падрыў яе святых асноў. Вы задаволілі цікавасць?

--Збольшага. Аднак, пане следчы, дазвольце заўважыць, што ў вашых паводзінах ёсць пэўная дзіўнасць. Спачатку вы безапеляцыйна заявілі, што раман напісаў я, а потым згадзіліся расказаць аўтару ягоны ж сюжэт. Вы не адчуваеце тут супярэчнасці?

Можна ўявіць, як пасля гэтых слоў пісар пакутліва моршчыцца, каб не засмяяцца.

■

Явецкі бясслаўна вярнуўся ў Варшаву. Следчая камісія вырашыла атрымаць хоць ускоснае прызнанне Незабытоўскага, дзеля чаго яму дазволілі напісаць лісты да сваякоў.

"Злачынца" быў напагатове.

На лісце да сястры Валерыі з'яўляецца рэзалюцыя: пакінуць у асобым аддзяленні. Дзякуючы гэтаму сёння можна атрымаць дадатковыя штрыхі да партрэта ўжо безнадзейна хворага на спінную сухотку, але нязломленага вязня камеры № 13. "Седзячы ў няволі, я ўяўляю, што на свабодзе ўжо нікога няма... Цяпер у твайго брата барада ў пояс, вусы ад вуха да вуха, пазногці больш падобныя да кіпцюроў, а калі я і раней быў бялявы, то цяпер зусім пасівеў... Аднак я ніколі не быў у такім цудоўным становішчы: мяне цяпер баяцца генералы!.. Як толькі выйду адсюль (а я павінен выйсці абавязкова, бо невінаваты і даказаў сваю невінаватасць), то куплю для пляменніка Ежы кнігу па гісторыі, а Анельцы ў падарунак – зборнік вершаў..."

З доўгага абвінаваўчага акту працытуем толькі адзін пункт: "Прызнаецца, што з дзяцінства ненавідзіць дэспатызм, рабства і арыстакратыю і што любоў да свабоды і нянавісць да яе ворагаў успрыняў з малаком маці і глыбока ўкараніў у сваю душу рэспубліканскія правілы."

■

Прысуд палявога аўдытарыята дзейнай арміі быў канфірмаваны генерал-фельдмаршалам Паскевічам 17 лютага 1849 года. Праз дзень адпаведны рапарт лёг на стол цару Мікалаю І, які пакінуў пакаранне без зменаў. Неўзабаве ў кабінеце віленскага генерал-губернатара зухавата шчоўкнуў абцасамі сталічны фельд'егер, што неадкладна атрымаў прагонныя на пару коней ад Вільні да Табольска і назад.

Аднак адмераныя царскім правасуддзем дваццаць катаржных гадоў ужо не палохалі Аляксандра Незабытоўскага. Ён адчуваў, што хвароба пакінула яму лічаныя дні. Перавесці палітычнага арыштанта з камеры ў шпіталь можна было толькі з дазволу імператара. Мікалай І падпісаў "літасцівы" дазвол 21 сакавіка. У той самы дзень турэмны доктар канстатаваў, што сэрца беларускага вольнадумца, якому ішоў трыццаты год, спынілася.

Праз тыдзень цару трэці раз далажылі пра непакорнага палітычнага злачынцу, і на матэрыялах судовай справы з'явіўся грыф: "Захоўваць вечна".

"ВОРАГІ НАШЫ НІКОЛІ НЕ РАЗДЗЯЛЯЛІ СЛОВА І СПРАВЫ І ЗА СЛОВА КАТАВАЛІ ЧАСТА ЯШЧЭ БОЛЬШ ЖОРСТКА, ЧЫМ ЗА СПРАВУ". НА АБШАРАХ БЫЛОЙ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ ГЭТАЕ НАЗІРАННЕ АЛЯКСАНДРА ГЕРЦЭНА ЗАХАВАЛА САВЮ АКТУАЛЬНАСЦЬ ДА САМАГА КАНЦА XX СТАГОДДЗЯ.

Лявон БАРШЧЭЎСКІ, *намеснік старшыні Беларускага Хельсінкскага Камітэта:*

Я ЧАКАЎ НОВЫХ УДАРАЎ, АЛЕ КАМАНДЗІРСКІ ГОЛАС СКАЗАЎ: "ВСЁ. ЛЕОНИДА ПЕТРОВИЧА БОЛЬШЕ НЕ БИТЬ."

26 красавіка 1996 года, калі скончыўся мітынг пасля "Чарнобыльскага шляху", я з сябрамі паехалі ў сядзібу БНФ, што на Варвашэні, 8. Калі мы пад'язджалі да сядзібы, то адразу ў вочы нам кінуўся аўтобус з завешанымі фіранкамі вокнамі. Праз нейкае імгненне адтуль выскачыла чалавек пяць у цёмных уніформах і спартыўных касцюмах, у чорных масках і з аўтаматамі. Раздаліся крыкі: "Берите этого петуха!" -- і адборныя мацюкі. Гэтыя людзі накінуліся на мяне з бакоў і са спіны, сталі моцна біць нагамі ў спіну і запіхваць у аўтобус. Я паспеў толькі крыкнуць дэпутату Паўлу Знаўцу: "Глядзі і запамінай, што робяць!"

Мяне закінулі ў сярэдзіну салона, парваўшы плашч. Я чакаў новых удараў, але ў салоне нехта камандзірскім голасам сказаў: "Все! Леонида Петровича больше не бить!" Я пачуў, што каля дзвярэй аўтобуса Павел Знавец, паказваючы дэпутацкае пасведчанне, спрабуе нечага патрабаваць ад гэтых людзей. Выніку, натуральна, няма ніякага. Дзверы аўтобуса зачыняюцца. У паўцемры ўсе "героі" ў масках сядзяць ціха, бо той жа камандзірскі голас загадаў ім чакаць далей. Я падумаў сабе, што іх наступнай ахвярай павінен быць Зянон Пазьняк -- і суцяшаў сябе: чым даўжэй яны чакаюць, тым далей ад гэтага месца паспее ад'ехаць лідэр Фронту.

Праз хвілін 20 аўтобус пад'ехаў да самых дзвярэй сядзібы, людзі ў масках (апроч двух) выскачылі на вуліцу, і праз якія дзве хвіліны ў аўтобус пры тых самых мацюках запіхнулі новых ахвяр – дэпутата Знаўца, кіроўцу РАФа Уладзіміра Ляпарскага, непаўналетняга яшчэ ўдзельніка маладзёжнай фракцыі Аляксандра Шыбко, які затрымаўся пасля дзённага дзяжурства ў памяшканні, а таксама двух чалавек, якія выпадкова зайшлі даведацца пра навіны ў сядзібе БНФ, -- Ірыну Важнік і Андрэя Скачко. Потым у аўтобус былі закінутыя "трафеі" – афіцыйная харугва БНФ, некалькі звычайных бел-чырвона-белых сцягоў, яшчэ нейкія рэчы...

Аўтобус ірвануў з месца. Ірына Важнік, адзіная жанчына сярод усіх, халерычка паводле натуры, спыталася ў людзей у масках: "Куды ж вы нас везяце". Адзін з іх адказаў: "Куда надо", а потым дадаў па-беларуску: "У Курапаты".

■

Праз хвілін 15 аўтобус спыніўся. Праз ветравую шыбу быў відзён будынак міліцыі на Інтэрнацыянальнай вуліцы. Пасля паўгадзіннага чакання нас усіх павялі на трэці паверх гэтага будынка, дзе, аказваецца, месцяцца кабінеты следчых гарадской пракуратуры. Адзін з гэтых следчых запрасіў мяне на допыт. "У якасці каго?" – спытаў я. – "У якасці сведкі." – "Ці ж сведак да вас заўсёды дастаўляюць такім чынам, напаўшы на вуліцы ў цемры ды надаваўшы па спіне?" – "Калі ў вас ёсць сінякі або пашкоджанні, я выпішу накіраванне на судова-медыцынскую экспертызу," – адказаў ён.

Допыт быў з выхаваўчым падтэкстам. Следчы казаў: "Чарнобыльскі шлях" – гэта добра, але навошта ж біць міліцыю і перакульваць машыны?" Я заўважыў яму, што я асабіста не толькі не біў і не перакульваў, але ўвесь час шэсця сядзеў у машыне і не пакідаў яе – так, як раней было дамоўлена на перамовах кіраўніцтва Фронту з міліцэйскім начальствам горада. Потым я дадаў: "Вы добра паглядзіце відэастужкі. Мяркую, вы зможаце знайсці сярод тых, хто лез у бойку і перакульваў машыны, сяго-таго з блізкіх да вас ведамстваў..." Следчы, аднак, гэтага ў свой пратакол заносіць не стаў.

Пасля допыту скончыліся тры гадзіны, на якія закон дазваляе затрымліваць чалавека для высвятлення яго асобы. "Мне можна ехаць дадому?" – спытаў я ў следчага. – "Зараз вам выпішуць накіраванне на экспертызу, а пасля вы пасядзіце крыху ў Ленінскім пакоі." – "Паводле якога такога закону?" – "Я проста павінен трохі падумаць, як з вамі быць." – "Вы разумееце, што парушаеце закон, а ў дачыненні да дэпутата Знаўца -- і Канстытуцыю?" – "Ну, са Знаўцом тут не зусім добра выйшла... Але неяк разбяромся... Пасядзіце пакуль што ў Ленінскім пакоі."

Мяне адвялі (міма бюстаў "железного Феликса" і правадыра сусветнага пралетарыяту) у той самы "ленінскі пакой" (на другім паверсе будынка). Там былі ўсе мае сябры па гэтых падзеях, "пасажыры" таго самага аўтобуса, і яшчэ некалькі чалавек, сярод якіх я пазнаў свайго старога знаёмага, мастака Васіля Маева. Праз хвілін 15 да нас зазірнуў следчы і сказаў, што паедзе ў Ленінскі РАУС разбірацца з "хохламі" (відаць, з затрыманымі ўкраінцамі), а калі вернецца, нарэшце вырашыць, што рабіць з намі. Пратэсту дэпутата Знаўца і нашых ён слухаць не стаў, а хуценька знік, пакінуўшы на нас ахову з двух міліцыянераў ва ўніформе і двух маладых хлопцаў у спартовых касцюмах. Дарэчы, вельмі спецыфічнае ўражанне пакідаюць людзі, якія ахоўваюць цябе ў спартовых касцюмах: ні даць, ні ўзяць "добраахвотных памочнікі міліцыі"!

Хутка мы зразумелі, што следчага нам давядзецца чакаць і чакаць. Натуральна, што ні пазваніць дадому, ні звязацца з адвакатам ахова нам не дазваляла. Спробы Паўла Знаўца патэлефанаваць у Вярхоўны Савет або ў пракуратуру таксама ні да чаго не прывялі: да тэлефона яго не падпускалі ані блізка. І ўсё ж зломленымі сябе ў гэтай зале мы не адчувалі. Нехта пачаў напяваць "сівога каня", іншыя пачалі падцягваць. А потым беларускія песні паліліся адна за адной... Калі мы праспявалі "Магутны Божа...", міліцыянты неяк заварушыліся. Каля сямі раніцы прыйшоў міліцэйскі афіцэр і загадаў нам спыніць спевы: маўляў, досыць ужо...

■

Следчы прамільгнуў у дзвярах каля дзевятай раніцы, але [illegible] да нас не выклікаў. Міліцыянты ж на нашы [illegible] патрабаванні паклікаць яго паціскалі плячыма. Каля 12 гадзін (гэта ўжо было 27 красавіка) да нас прывялі Вінцука Вячорку, намесніка старшыні Фронту. Ён расказаў нам, што яго захапілі і запіхнулі (разбіўшы пры гэтым яго акуляры) у чорную "Волгу" людзі ў цывільным. Адбылося гэта каля пад'езда ягонага дома.

Неўзабаве мяне выклікаў следчы і пры мне склаў пратакол аб адміністратыўным правапарушэнні, якое быццам бы мела месца з майго боку ў час "Чарнобыльскага шляху". Заўважу, што адбылося гэта праз 14 гадзін пасля майго затрымання -- і гэта не ўпісваецца ні ў якія рамкі закону. Натуральна, што я з абвінавачваннем не пагадзіўся, пра што і напісаў у тым пратаколе (потым у судзе, перачытваючы пратакол, я са здзіўленнем убачыў, што да ранейшых абвінавачванняў была дапісана фраза, што я "не реагировал на предупреждения работников милиции", – хоць ніякіх папярэджанняў не было і блізка!)

Пасля працэдуры складання гэтага "пратаколу" мяне павялі ў дзяжурнае памяшканне. Калі пачалі канфіскоўваць рэчы, я зразумеў, што павязуць у турму. У якую – ніхто з прысутных адказу мне не даў. Тут я атрымаў магчымасць на адну хвіліну патэлефанаваць дадому, але нічога канкрэтнага жонцы паведаміць я яшчэ не мог.

Пасля гэтага прайшлі прыніжальныя працэдуры вобыску (да самых шкарпэтак!) у міліцыі і ў "ізалятары-размеркавальніку" на вуліцы Акрэсціна, куды мяне прывезлі разам з чарнобыльцам-ліквідатарам Андрэем Рысяўцом, журналістам Алегам Трызнам, інжынерам Аляксандрам Пятрушыным, студэнтам універсітэта культуры Аляксеем Матафонавым.

■

І вось камера. Драўляныя нары-пастамент з пакарабачаных дошак (з-за болю ў спіне – пасля доблесных дзеянняў людзей у масках - спаць даводзілася на жываце або на правым баку), маленькі праход каля дзвярэй, вузенькае акно з кратамі і на тры чвэрці зашклёная "параша" з кранікам для вады. Зрэшты, неўзабаве вада знікла і адсутнічала яшчэ амаль двое сутак. Сняданак – кавалак чорнага хлеба і конаўка "чаю", бураватай, крыху саладкаватай вадкасці. Абед – суп, каша з крупаў і "общепитовский" шніцаль, на 80% з хлеба. Вячэра ў гэтай установе не палажаная зусім.

Назаўтра ўранні ўсю нашу "пяцёрку" перакінулі ў камеру насупраць. У гэтай камеры нас было трынаццаць, у тым ліку мастак Васіль Маеў, яго калегі -- скульптары Алесь Мірончык і Аляксандр Карніцкі (на шэсці і мітынгу не былі), студэнты мінскіх ВНУ з прозвішчамі Корсак і Сівец, украінец Уладзімір Дрыгайла...

Трынаццаты быў малады хлопец, які надзіва добра арыентаваўся ў турэмным жыцці, ён сказаў нам, што быў затрыманы нібыта проста за бойку ў сваім двары. Рана-раненька, калі яшчэ не працуюць ніякія суды, яго выклікалі з рэчамі, і болей мы гэтага хлопца не бачылі.

Задуха ў гэтай камеры была страшэнная. У другой палове дня ў мяне пачала моцна балець галава. Але турэмныя дактары ў нядзелю (як і ў суботу) не працуюць, а ў турэмнай аптэчцы, як сказалі нам наглядчыкі, "няма нічога".

■

29 красавіка ўсе мы чакалі, што з раніцы нас пачнуць вазіць у суды (так нам было сказана раней). Але суды пачаліся толькі ў другой палове дня. І былі яны проста ў будынку турмы. Пад канвоем падсуднага выклікалі ў асобны пакой, дзе "працаваў" суддзя з якога-небудзь раённага суда горада Мінска разам з сакратаром. Тых, хто хацеў запрасіць якіх-небудзь сведак або адваката, адпраўлялі назад у камеры, паабяцаўшы, што будуць шукаць гэтых людзей, але "ўсё гэта можа зацягнуцца не на адзін дзень".

Калі ў "суд" выклікалі мяне, я адразу зрабіў хадайніцтва запрасіць майго адваката Дудараву і даў суддзі ўсе яе каардынаты. Маю прапанову даць магчымасць мне самому па тэлефоне звязацца з адвакатам суддзя адкінуў! "Будзем шукаць самі". Асуджаных (каго на трое, каго на пяць, каго на дзесяць сутак) таварышаў па нашай камеры разводзілі ўжо па іншых камерах. Нас з украінцам Уладзімірам Дрыгайлам адправілі зноў у маленькую камеру, дзе я правёў першую ноч. З яе перад намі вывелі восем чалавек -- і я не ўяўляю, як яны маглі там размяшчацца.

Неўзабаве мы атрымалі ў нашай камеры трэцяга чалавека – віцябчаніна Пятра Сараленю. Потым Дрыгайлу ад нас забралі, але прывялі двух іншых украінцаў -- Сяргея Патапава і Андрэя Гоца, якія ўжо аб'явілі галадоўку ў знак пратэсту супраць таго, "што робяць з людзьмі ў вас у Беларусі". Апроч таго, да нас далучылі траіх хлопцаў-студэнтаў, якія не мелі дачынення да "Чарнобыльскага шляху", але позна ўвечары былі захопленыя каля Белдзяржфілармоніі ў час АМАПаўскай аблавы. Хлопцы казалі, што да ўчарашняга дня палітыка іх не цікавіла, але цяпер яны – прыхільнікі БНФ і будуць хадзіць на ўсе мітынгі і дэманстрацыі. 18-гадовы студэнт фізфака БДУ з абурэннем расказваў, як пры ім АМАПаўцы паставілі на калені на тратуары дзяўчат, а сярод іх і яго каханую... "Калі б яны зачапілі яе хоць пальцам, я б падняўся і задушыў таго, хто гэта робіць", -- сказаў ён.

■

У аўторак, 30-га красавіка, пасля нялёгкай ночы ў перапоўненай камеры і напружанага чакання ўсю раніцу, мяне павезлі ў суд. Чамусьці гэта быў суд Маскоўскага раёна, хоць шэсце адбывалася ў Савецкім, а затрымалі мяне ў Цэнтральным раёне. Адвакат Дударава дапамагла, я быў адпушчаны на волю "да высвятлення абставін". Пазней мяне выклікалі ў гэты суд і прызначылі новы працэс.

СОВЕТСКИЙ ТОТАЛИТАРИЗМ

УДУШЕНИЕ ЭК

ГЛАВЫ ИЗ КНИГИ. НЕИЗВ

Татьяна ПРОТЬКО

"ПОРУЧИТЬ СКЛЯНСКОМУ, МАРКОВУ, ПЕТРОВСКОМУ И ДЗЕРЖИНСКОМУ АРЕСТОВАТЬ НЕСКОЛЬКИХ ЧЛЕНОВ ИСПОЛКОМОВ И КОМБЕДОВ В ТЕХ МЕСТНОСТЯХ, ГДЕ РАСЧИСТКА СНЕГА ПРОИЗВОДИТСЯ НЕ ВПОЛНЕ УДОВЛЕТВОРИТЕЛЬНО. В ТЕХ ЖЕ МЕСТНОСТЯХ ВЗЯТЬ ЗАЛОЖНИКОВ ИЗ КРЕСТЬЯН С ТЕМ, ЧТО, ЕСЛИ РАСЧИСТКА СНЕГА НЕ БУДЕТ ПРОИЗВЕДЕНА, ОНИ БУДУТ РАССТРЕЛЯНЫ."

Из постановления Совета Обороны, 15 февраля 1919г.

В январе 1921г. для борьбы с "экономической контрреволюцией" в структуре ВЧК было создано специальное экономическое управление, которому подчинялись аналогичные губернские отделы. В ЧК Белоруссии экономический отдел (ЭКО) входил в структуру секретно-оперативной части. В задачи ЭКО включался надзор за деятельностью Совнархоза, Наркомпрода, Государственными и частными предприятиями. ЭКО вел следственные дела, имел свою агентурную сеть, оказывал содействие в осуществлении налоговой политики.

В декабре 1922г. на основании указаний, поступивших из ОГПУ, были сформулированы общие положения деятельности ЭКО: "1. Основой в работе экономического отделения должно явиться всестороннее освещение всей экономической жизни Белорусской Республики с целью выявления ненормальных и преступных сторон, в виде экономического предательства, технической измены, экономшпионажа, крупного саботажа, подлогов и т.п. 2. Главную роль в работе экономотделов должно сыграть квалифицированное специальное осведомление. С этой целью оно должно иметь постоянное наблюдение и руководство за специальным осведомлением в лице пом.начальника и экономсовещению. 3. Приступить к немедленному насаждению специальной агентуры по хозорганам для ведения спец.работы по крупным агентурным разработкам. 4. Сведения, добытые о работе того или иного хозоргана негласным путем, должны сопоставляться с параллельно полученными сведениями осведомительного характера, и все это до установления факта должно концентрироваться в литерном деле, а затем выделяться в агентурное, затем, после производства операции, заводиться следственное дело..."

Экономическими отделами составлялись личные карточки предприятий, работающих во вред государственной экономике. ЭКО также выявляло "политическую физиономию руководителей и работников предприятий и учреждений", кратко характеризовало их и передавало полученную информацию в секретное отделение.

Была регламентирована деятельность и местных подразделений ЭКО. "2. Для изучения всех сторон хозяйственной жизни губернии следует создать в соответствующих областях промышленности сеть осведомителей из числа спецов. 3. Наряду с работой по изучению крупной промышленности обратить сугубое внимание на сельское хозяйство и подведомственные ему учреждения как непосредственно связанные с крупной промышленностью", -- указывалось в резолюции, принятой 5 марта 1922г. на съезде бывших начальников Политбюро Гомельской губернии.

■■■

К началу 30-х годов масштаб деятельности ЭКО стал еще более широким. Под его контролем теперь находилась работа всех центральных и местных организаций и учреждений, деятельность их администрации. Спецслужбы зорко следили за хозяйственной деятельностью и в мае 1932г. сигнализировали ЦКК КПбБ:

"По имеющимся в ЭКО ПП ОГПУ Бел. сведениям, руководители районных организаций по Азаричскому району усиленно занимаются самоснабжением, возбуждая против себя недовольство крестьян. Так, присланные овчины для премирования сдатчиков кожсырья пошли не по назначению – секретарь райкома, председатель РИКа, зав.Райземотделом, Райагроном, Пред.коопсоюза, Зав. АПО Райкома, Пред.Профсоюза и др. пошили себе из этих овчин шубы... Собрание рабочих артели свело прения по вопросу о мобилизации средств к тому, что районные работники пользуются привилегиями, приводились примеры". "Изложенное" сообщалось для "воздействия" по партийной линии.

К середине 30-х годов экономический отдел по числу секретных сотрудников находился на 3-м месте после секретно-политического и особого. В апреле 1936г. на учете в ЭКО состояло 1326 агентов.

Перед отделом ставилась задача "особое внимание уделить вербовкам на режимных предприятиях, по совхозам, сельскохозяйственным вузам, районам промышленного характера". В 1935г., например, ЭКО имел свою агентуру: на Оршанской льночесальной фабрике – 5 осведомителей, Белгресе – 4 спецосведомителя и 3 осведомителя, Государственном цементном заводе – 9 осведомителей...

Экономический отдел обладал огромной информацией о деятельности практически всех сторон экономического механизма республики. Во второй половине 30-х годов он собирал сведения о выполнении планов, производственных заданий, анализировал деятельность отдельных предприятий и отраслей. Результаты негласных проверок, донесения осведомителей оформлялись в виде "спецсообщений", "докладных записок", "просто информационных сообщений" и передавались секретарям ЦК КПбБ, в промышленный и хозяйственный отделы.

В декабре 1934г. нарком внутренних дел информировал Н. Гикало лично о результатах проверки наличия льна в районах республики. "Нами проведена негласная проверка отдельных колхозов в Могилевском, Шкловском, Быховском, Жлобинском, Гомельском, Буда-Кошелевском, Уваровичском, Мозырском, Парическом и Петриковском районах БССР... Проверкой установлено, что не все колхозы "подчистую" сдавали льноволокно государству: в отдельных колхозах его было обнаружено по 25—50 пудов."

В отделы ЦК КПбБ направлялись более подробные сведения. В мае 1935г. в промотдел была дана информация о состоянии лесозавода им. Халтурина в г. Рогачеве: завод систематически не выполнял план, старое оборудование грозило авариями с человеческими жертвами. Сельхозотдел ставился в известность о плохом ремонте уборочных сельхозмашин в совхозе "Буденовец" Червенського района, отсутствии кормов на свиноферме совхоза "Соревнование" Дубровенского района.

■■■

Информация, посылаемая спецслужбами руководителям республики, носила объективный характер, отражала реальное положение экономики Белоруссии, хотя не содержала глубоких аналитических выводов. В спецзаписке "О ходе торфодобычи по торфозаводу "Осинторф" НКВД ставило в известность секретаря ЦК КПбБ "о невыполнении плана по всем способам добычи торфа". Констатируя срыв плана, нарком НКВД указал и на другие недостатки "социалистического торфопроизводства" – нехватку рабочей силы, неиспользование внутризаводских возможностей, большие простои техники. "На участках царят безответственность, бесконтрольность и игнорирование начальниками участков дирекции завода."

Анализ причин, приведших к тем или иным срывам, делался спецслужбами исходя из определенных, заранее заданных предпосылок. Причины искали не в нарушении законов экономического развития, отсутствии заинтересованности в результатах труда, внедрения достижений научно-технического прогресса, а в политических недостатках "кадров".

В докладной записке "О состоянии лесозаготовок и лесовывозок по БССР на 25 ноября 1938г." указывалось, что план 4-го квартала по заготовкам древесины выполнен на 30,1%, по ее вывозке – на 26,4%. "Анализ материалов о ходе лесозаготовок и лесовывозок свидетельствует о том, что несмотря на полную реальность спущенных планов, выполнение их явно стоит под угрозой срыва. Причинами столь медленного выполнения плана заготовок и вывозок является слабое руководство заготовками со стороны НКЛ БССР, неподготовленность к ним Леспромхозов и мехпунктов и недостаточное внимание к этой хозполитической кампании со стороны местных партийных и советских организаций".

26 июня 1936г. нарком Внутренних дел БССР Лепельской докладывал в Москву о результатах только что проведенного стахановского декадника по их строительству: сделано 896 км дорог при плане 751 км, план озеленения выполнен на 140,4%. "Сейчас особо нажимаем на окончание строительства мостов, на вывозку гравия, на сборку местного камня. Нажимаем, чтобы темпы работ по строительству стратегических дорог, взятые в стахановской декаде, сохранить на достигнутом уровне."

Стахановские методы не были главными в работе, они в большей мере представляли показной энтузиазм, подкрепленный бдительным надзором спецслужб. "Одновременно на участок посылаю группу работников НКВД для проверки правильности произведенных расходов и точного учета количества добытых материалов."

Начальники окружных, городских, районных организаций НКВД обязывались "ставить перед РИКами и райкомами" вопросы, связанные со строительством. "Предлагается вам непосредственно и немедленно включиться в дело строительства дорог и принять надлежащие меры к тому, чтобы все работы были закончены в установленные правительством и наркомом союза тов. Ягода сроки, обеспечить высокое качество работ, стопроцентное выполнение постановления СНК о трудучастии."

■■■

Спецслужбы не только информировали высшее партийное руководство республики. Они и сами, осуществляя контроль за выполнением правительственных директив, называли виновных. "В целях пресечения действий классового врага, направленных к срыву борьбы с вредителями растений, разоблачения преступно-небрежного отношения к делу защиты и сохранения урожая" Нарком внутренних дел в директиве от 10 июля 1935г. предлагал своим подчиненным в районах, "через агентуру тщательно проверить и установить все факты неправильного распределения, засылок, залежей химикатов и аппаратуры... и принять меры к немедленному устранению вскрытых дефектов".

Согласно постановления пленума ЦК ВКПб от 1—4 июня 1936г. "Об уборке урожая и сельхоззаготовках", с 10 июля по БССР прекращалась колхозная и индивидуально-крестьянская торговля хлебом. Органы НКВД обязывались обеспечить выполнение этого постановления. С помощью гласных и негласных сотрудников осведомительной сети устанавливались факты "незаконной торговли". Дела на привозивших хлеб на продажу передавались в суд, виновные арестовывались с обвинением в спекуляции.

Борьба со спекуляцией была под особым контролем спецслужб. Работа органов НКВД в этой области была главным образом направлена на выявление "вредной" деятельности сотрудников государственных учреждений. "Имеющиеся материалы свидетельствуют о наличии организованных групп спекулянтов, которые входят в соглашение с работниками торгующих организаций, получают от них дефицитные товары и перепродают. Спекулянты широко используют имеющуюся разницу в ценах на промтовары между городом и сельской местностью". Не помогало и запрещение торговать промышленными товарами. Дефицит продавался кустарям, которые его слегка "модернизировали и перепродавали уже как свою продукцию". Чтобы усилить контроль за спекуляцией, на базах госторговли и кооперации была создана обширная агентурная сеть, которая должна была контролировать хищения.

Борьба со спекуляцией, увы, не принесла эффекта. В январе 1937г. нарком внутренних дел сообщал наркому юстиции о затяжке рассмотрения в судах дел о спекуляции. За октябрь-ноябрь и 15 дней декабря 1936г. в суды было передано 337 дел о спекуляции на 416 человек. Суды же рассмотрели только 195, осудив 255 человек.

Объяснить судебные задержки в этот период легко – спекуляция казалась не таким уж значительным преступлением по сравнению с "контрреволюционной" деятельностью крестьян. В 1936г. за спекуляцию к уголовной ответственности было привлечено 1457 чел., за хищения, растраты, подлоги – 653 чел. (из 19.977 всех осужденных по БССР).

■■■

К концу 30-х годов агентурная и осведомительная сеть привлекалась к выявлению фактов наличия в крестьянских домах запасов печеного хлеба, проверке подготовки к весеннему севу и уборке, к контролю за строительством складов, учреждений. Органы НКВД БССР сообщали в прокуратуру о том, что "план строительства на 1936г. по стационарному оборудованию связи Строительной конторой Белорусского управления связи выполнен до 50%".

Спецслужбы констатировали плохую организацию работ, небрежное хранение материалов, отсутствие учета. Сообщая о том в прокуратуру, нарком Внутренних дел просил "о производстве расследования".

В 1929—32гг. сотрудники спецслужб вместе с местными партийными и советскими органами приняли активное участие в "ликвидации кулачества как класса". Задачи и функции различных органов государства в проведении этой политики были определены постановлением ЦИК и СНК СССР от 1 февраля 1930г. "О мероприятиях по укреплению социалистического переустройства сельского хозяйства в районах сплошной коллективизации и по борьбе с кулачеством". В принятой в дополнение к постановлению секретной инструкции для ЦИК и СНК союзных республик определялся порядок раскулачивания. Основную работу проводили исполкомы местных Советов: определяли, кто должен быть раскулачен, в каких размерах следует конфисковать имущество, кого из раскулаченных и куда высылать. На спецслужбы возлагалось оперативное обеспечение выселенных, аресты кулаков "для предотвращения бандитизма".

В середине 30-х годов спецслужбы стали вскрывать на селе "контрреволюционные организации". Только по Витебскому сектору НКВД в 14 подчиненных ему районах в 1934г. велись дела "Священные" (25 человек) и "Белогвардейцы" (25 чел.) – в зоне Горецкой МТС; "Осевшие" (19 чел.) и "Максималисты" – в Суражском районе; "Волки" – в Лиозненском, "Упорные" (45 чел.) – в Городокском районе. Однако этого было недостаточно, и республиканские руководители в январе 1936г. отметили "плохую работу" по ведению дел в Витебском секторе.

"Контрреволюционные организации" создавались следующим образом. В 1936г. в колхозе "Ковалевщина" Ушачского района Лепельского округа " пало 3 лошади от чрезмерной эксплуатации". Все, кто работал на лошадях, а также

ЕЩЕ НЕ УШЕЛ В ИСТОРИЮ

бригадир колхоза были зачислены в "организацию".

В системе Бобруйского райпотребсоюза наблюдались срыв молокопоставок и плохое снабжение хлебом, промышленные товары не завозились в села, а продавались в городе, дефицит раздавался "своим" людям. "Контрреволюционная троцкистская вредительско-хищническая" организация Бобруйского райпотребсоюза была "разоблачена". В нее входили председатель райпотребсоюза, зав. торговым отделом, уполномоченный по закупкам хлеба, директор маслозавода.

В марте 1936г. начальник Могилевского сектора получил из Минска директиву, в которой указывалось: "В течение ряда лет Мстиславльский район является прорывным. Все планы срываются. Имеющиеся материалы свидетельствуют об организованной контрреволюционной кулацкой работе на ряде участков и в ряде колхозов этого района. Вам предлагается: послать помощника, переговорить с агентурой лично и представить практические предложения, связанные как с очисткой колхозов от кулаков, так и особенно в части вскрытия организованных контрреволюционных формирований".

С кулацкими "вредителями" не церемонились. В марте 1935г. начальник Витебского сектора НКВД БССР сообщал в Минск, что за период с 15 февраля по 1 марта по районам сектора (без Витебска и Горецкого района) было подвергнуто аресту 375 чел., из них по Оршанскому району – 100 чел., по Чашниковскому – 67, Россонскому – 57, Толочинскому – более 50.

"В целях своевременного пресечения дезорганизующей деятельности антисоветских элементов в деревне и устранения недочетов в ходе подготовки к уборочной кампании" спецслужбы на местах получили задание: "Заострить внимание агентуры на селе на проверке ремонта сельхозорудий и машин, обеспеченности запасными частями, их рационального распределения, оборудованности ремонтных мастерских и обеспеченности их рабочей силой. Особое внимание должно быть уделено качеству ремонта сложных сельскохозяйственных машин, агрегатов и подготовке кадров для их обслуживания". Сотрудники спецслужб должны были "ставить вопрос в партийных и советских органах, добиваясь устранения недочетов". Нарушители трудовой дисциплины предавались суду.

■■■

Борьба государства с вредителями стала главным "двигателем" "социалистической" экономики в тридцатые годы. Их, вредителей, находили повсюду: там, где не выполнялись производственные планы, случались аварии, была низкая производственная дисциплина. "Вредители" были одиночками или объединены в контрреволюционные "организации", их обнаруживали в государственных учреждениях, колхозах, вузах.

При нормированной заработной плате, практически независимой от результатов труда, только страх мог заставлять работать более производительно. Страх должен был стимулировать рост производительности труда, модернизацию производства, внедрение новой техники. В этих условиях работа спецслужб, особенно экономического отдела, становилась одним из главных факторов экономического развития республики. От интенсивной борьбы с "вредителями" зависело само существование "социализма".

С целью нагнетания страха и "раскрывались" разного рода организации, устраивались показательные процессы. В мае 1931г. ЭКО принял участие в ликвидации "Белорусского филиала Трудовой крестьянской партии". Социальной базой контрреволюции в сельском хозяйстве считались "организованные в производственныее объединения кулацкие элементы, вооруженные охотничьи товарищества и крестьяне-опытники, владельцы так называемых "культурных хозяйств", а также кулацкая часть добровольных корреспондентов ЦСУ".

"Ячейки" ТПК были обнаружены в Наркомземе БССР, сельскохозяйственной секции Госплана, в ЦСУ, Белсельсоюзе, Белколхозцентре, Белсельтресте, НИИ сельского хозяйства, Белколхозстрое. По делу о контрреволюционной деятельности членов Трудовой крестьянской партии было арестовано 59 человек. Коллегия ОГПУ по БССР приговорила их к различным срокам наказания: 6 человек к расстрелу (четырем расстрел заменили 10 годами заключения в концлагерях), 13 – к 10 годам концлагерей, 6 – заключались в лагеря на срок от 3 до 5 лет. 34 члена "организации" после замены лагерей высылкой отправлялись в Сибирь, Казахстан.

Члены белорусского филиала ТПК были "связаны" с другими "контрреволюционерами", в том числе с членами Белорусского филиала "Промпартии". В Промпартию записали руководителей Госплана БССР, ВСНХ, Белстройобъединения, Белметаллообъединения, Белкожобъединения – всего 30 человек. Им инкриминировалось "желание перерождения советской власти в буржуазно-демократическую республику", проведение мероприятий, "которые должны были мешать и тормозить развитие народного хозяйства и создавать те или иные порывы и затруднения".

Решением Коллегии ОГПУ по БССР члены этой "организации" были осуждены к различным срокам исправительно-трудовых лагерей: 10 человек к 10 годам, остальные – к 5 годам.

В ноябре 1932г. в Минске была раскрыта "контрреволюционная организация", которая "проводила подрывную работу в сельском хозяйстве, срывала работу МТС, колхозов и совхозов, умышленно вызывая снижение урожайности в колхозах и совхозах, разваливая их, создавая массовое недовольство крестьян, чтобы этим подготовить их участие в борьбе с Советской властью".

"Вредителей" нашли в Трактороцентре и Наркомземе – всего было арестовано 650 чел., в системе животноводства и ветеринарии – арестовано 94 чел. С 15 декабря 1932г. по 4 января 1933г. с помощью ГПУ БССР, по данным 57 районов Белоруссии, было исключено из партии 998 человек, 325 из них сразу отданы под суд. 484 человека получили партийные взыскания. В деревне было "учтено" 46.540 человек "кулацко-антисоветского элемента".

С мая 1932г. по май 1933г. было "раскрыто" 42 контрреволюционные повстанческие организации, 2.828 кулацких групп, арестовано 43.552 человека.

■■■

14 марта 1933г. ЦИК СССР принял постановление о контрреволюционной деятельности государственных служащих. Это постановление давало право рассмотрения на судебных заседаниях коллегии ОГПУ дел по диверсии, поджогам, взрывам и "прочим видам вредительства" "с применением, в зависимости от характера преступления, всех мер репрессий". Постановление предусматривало, что следствие должно проводиться "с особой строгостью по отношению к уличенным в этих преступлениях".

Сразу же после постановления в Горках была раскрыта студенческая, а затем и преподавательские организации "контрреволюционеров" (20 чел.).

В конце 1933г. – первой половине 1934г. на базе Гомельского отделения ПП ОГПУ по БССР была проведена операция всесоюзного масштаба – ликвидация "вредителей" в спичечной промышленности. Неважно, что многочисленные проверяющие комиссии установили: на спичечных фабриках "Везувий", "Маяк", "Белка", "Пламя" пожары были по техническим причинам – изношенное оборудование, простои, а затем "штурмовщина", переход на 3-х сменную работу был осуществляем "за счет массового пополнения рабочей силой, в большинстве совершенно неквалифицированной, без всякого производственного навыка".

Простои на фабриках, выпуск недоброкачественной продукции происходили из-за недостатка сырья (осины, бертолетовой соли, бумаги), отсутствия специалистов-спичечников. Спецслужбы по-своему определили причины этих явлений – "действия вредителей". Мнение о наличии вредителей на производстве разделяли и руководители предприятий – это снимало с них ответственность за экономическую безграмотность.

Действия Ч. переквалифицировать со ст. 201 ч. 2 УК Республики Беларусь на ст. 112 ч. 2 УК Республики Беларусь, в соответствии с которой назначить ему наказание в виде общественного порицания.

Исключить из резолютивной части приговора указание о взыскании с Ч. в пользу Р. и Р-вой 1.500.000 руб., а также госпошлины в доход государства в размере 150.000 руб.

4. КОММЕНТАРИЙ АДВОКАТА

Осужденный Ч. обратился ко мне за оказанием юридической помощи после провозглашения приговора суда Октябрьского района, признавшего его виновным в злостном хулиганстве.

Изучив материалы дела, и приговор суда, побеседовав с осужденным, я была поражена тем, насколько беззащитным и бесправным может оказаться человек перед людьми, призванными решать его судьбу. Многочисленные жалобы осужденного Ч. в органы милиции, прокуратуру, взывавшие к объективной оценке, просьбы разобраться в сложившейся ситуации оставались без ответа.

Не нашла понимания и позиция Ч. в суде при рассмотрении уголовного дела. Я бы даже сказала, что суд явно тенденциозно подошел к его рассмотрению: не были приняты во внимание ни разъяснения Пленума Верховного суда Республики Беларусь, ни сложившаяся судебная практика, ни конкретные обстоятельства дела. В основу обвинения Ч. были положены только лишь показания потерпевших, явно заинтересованных в исходе дела в их пользу: ведь именно они спровоцировали конфликт и вели себя самым вызывающим образом.

Будем считать, что Ч. повезло – Минский городской суд исправил ошибку нижестоящего суда, однако защита полагает, что Ч. не совсем обоснованно осужден и за причинение потерпевшему повреждения.

Анна ДОКУТЬКО

5. ПРИМЕЧАНИЕ "К"

Мозги отечественной фемиды до сих пор запудрены обвинительным уклоном. Защищайся, гражданин, как хочешь, и считай ты себя хоть трижды правым, суд не станет особо копаться в твоих проблемах. Хорошо, когда вышестоящий суд хоть мало-мальски разберется – остаемся довольны: пусть хоть так.

Дело Ч. закончено, но не прекращено, он все же остался виновным. Будет ли он бороться за себя дальше или махнет рукой: "Бог с ним, с этим порицанием", -- решать будет он сам. Но защитник говорит, что борьбу за справедливость можно продолжить. Ведь ст. 112 ч. 2 гласит: "Неосторожное менее тяжкое телесное повреждение – наказывается исправительными работами на срок до 1 года или общественным порицанием." По мнению адвоката, Ч. такого наказания не заслужил.

Подготовила страницу Наталья ДОЛГИХ

Алесь МІКАЛАЙЧАНКА

ВАЙНА Ў СЁМЫМ КЛАСЕ

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Старшыні Салігорскага гарвыканкама сп. Юрчыку Мікалаю Фёдаравічу

"Я, Мацюкевіч Марыя Сцяпанаўна, настаўніца беларускай мовы і літаратуры сярэдняй школы № 11, улічваючы ціск на дырэктара школы з боку вертыкальных структур, даю тлумачэнне аднаму з элементаў майго ўрока ў 7 "б" класе па кнізе вялікага песняра беларускага народа, прарока нацыянальнага адраджэння Янкі Купалы "Жыве Беларусь".

Пярэпалах сярод чыноўнікаў выкліканы тым, што адным з элементаў абсталявання на ўроку было выкарыстанне старадаўніх нацыянальных сімвалаў нашага народа – бел-чырвона-белага сцяжка і гебра "Пагоня", якія, на іх думку, з'яўляюцца забароненымі.

Справа ў тым, што пры падрыхтоўцы да ўрока мною не ставіліся "крамольныя" мэты палітычнага зместу. Мне неабходна было паказаць, што найгалоўнейшай тэмай творчасці народнага паэта (побач з сацыяльнай і маральна-этычнай) была нацыянальна-патрыятычная, і тым самым выхоўваць у навучэнцаў любоў і пашану да нашай нацыянальнай спадчыны, да роднага слова, да Бацькаўшчыны.

У прадмове да зборніка, якая мае назву "Несмяротная душа Беларусі", яго ўкладальнік Вячаслаў Рагойша адзначаў: "Янка Купала разумее, што кожная самастойная дзяржава павінна мець сваю нацыянальную сімволіку – Сцяг, Герб, Гімн. Паэт радаваўся, багачы, што бел-чырвона-белы сцяг як адзін з асноўных сімвалаў незалежнай дзяржавы Беларусь, нарэшце пачаў лунаць над беларускай зямлёй ("Беларускі сцяг уваскрос!")".

Дык што ж недазволенага зрабіла я на ўроку?...

Не патрэбна шукаць ворагаў у тых, хто самааддана любяць свой край, свой народ. Не да твару тым, каму (магчыма, нават па іроніі лёсу) даверана выконваць законы Рэспублікі Беларусь, сутыкаць ілбамі настаўнікаў, а таксама дырэктара з настаўнікамі.

Што ж датычыцца гістарычнай сімволікі беларускага народа – бел-чырвона-белага сцяга і герба "Пагоня", то іх ніхто не забараняў, а вынікі майскага рэферэндуму не выносіліся на разгляд Вярхоўнага Савета, які (і толькі ён) мае права ўносіць змены ў адпаведныя заканадаўчыя акты? Таму ні прэзідэнт, ні тым больш старшыня Салігорскага гарвыканкама не могуць быць па-за законам ці вышэй за яго."

19 кастрычніка 1995г.

ПА ЯКІМ ЗАКОНЕ ЖЫЦЬ?

Вытрымка з дыктафоннага запісу размовы журналіста з Тамарай Карняйчук, намесніцай загадчыка аддзела адукацыі Салігорскага гарвыканкама (4.04.1996г., г. Салігорск)

--Якая Ваша пазіцыя ў канфлікце?

--Я паважаю Марыю Сцяпанаўну як вельмі эрудыраванага настаўніка, чалавека вельмі эмацыянальнага, чалавека, які поўнасцю аддадзены справе адраджэння беларускасці, беларускай мовы, беларускай нацыянальнай свядомасці ў чалавеку, беларускай адукацыі. На сваіх уроках яна пастаянна гаворыць аб значэнні Радзімы для беларусаў, беларускім менталітэце.

Гістарычную беларускую сімволіку, скажам так, яна прымяніла на сваім уроку, які давала на момант правядзення свята беларускага пісьменства ў горадзе... Я разумею дырэктара школы. Школа з'яўляецца месцам, дзе загадам міністэрства адукацыі не дазваляецца ніякая палітычная агітацыя. Ведаеце такі дакумент? І калі мы сёння хочам жыць у прававой дзяржаве, мы павінны выконваць загады.

--Прабачце, а законы мы павінны выконваць? Вярхоўны Савет не адмяніў яшчэ старую сімволіку. Як тут быць? Вярхоўны Савет для нас – аўтарытэт ці не?

--Ён павінен быць аўтарытэтам. Але прымае столькі спрэчнага, столькі Законаў, якія адмяняюць адзін адно, што не ведаеш, па якіх Законах жыць. Мабыць, як казалі, трэба жыць па тым Законе або загаду, які з'яўляецца апошнім. Марыя Сцяпанаўна не будзе звольнена са сваёй работы. Таму што настаўнік, калі ён навучае дзяцей, дае ім веды, выхоўвае ў іх патрыятызм, ну, на якой выснове ён будзе звольнены з работы? І мовы быць не можа аб гэтым!.. Была размова і з дырэктарам школы. Была размова і з настаўніцай. І ніяк яны не могуць зразумець адзін адно. Я лічу, што ў гэтым канфлікце трэба проста пайсці насустрач адзін аднаму...

ДЗВЕ СІМВОЛІКІ – ДЗВЕ РАДЗІМЫ?

Як высветліў аўтар гэтых радкоў, ні кіраўніцтва аддзела адукацыі, ні старшыня гарвыканкама "Тлумачальнай запіскі" у Марыі Мацюкевіч не патрабавалі. Патрабаваў дырэктар СШ № 11 Уладзімір Каштальян. Па сведчанні Тамары Карняйчук, Марыя Мацюкевіч і Уладзімір Каштальян знаходзяцца ў канфлікце вось ужо два гады.

Як вядома, кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта М. Мяснікові распарадзіўся, каб у кожным офісе, кожным кабінеце офіса, у тым ліку і ў школах, на добрым для агляду месцы былі размешчаны паслярэферэндумаўскія сцяг і герб. Зразумела, гэта мера тычылася і школы, дырэктарам якой быў Уладзімір Каштальян, а настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Марыя Мацюкевіч.

Марыя Сцяпанаўна катэгарычна адмовілася размяшчаць у сваім кабінеце па-над класнай дошкай "новы" герб "з каласкамі". Маўляў, усе папярэднія гады яна выхоўвала ў дзецях павагу і любоў да іншых, сапраўдных нацыянальных сімвалаў -- бел-чырвона-белага сцяга і герба "Пагоня". Маўляў, вучні гэтага не зразумеюць – нельга педагогіку выцясняць з навучальнага працэса палітычнымі рашэннямі, якія да таго ж не зацверджаны Вярхоўным Саветам.

Але довады настаўніцы ніхто не прыняў да ведама. Было вырашана выканаць распараджэнне прэзідэнцкай Адміністрацыі ў стылі, які намесніца загадчыка аддзела адукацыі гарвыканкама Тамара Карняйчук ахарактарызавала так: самы апошні загад начальства – самы законны.

З вучнямі школы (а СШ № 11 – школа беларуская, да таго ж з харэаграфічным ухілам, адсюль, мяркуецца, выйдуць людзі культуры, людзі мастацтва) ніхто не патлумачыўся. Не дзіва, што выхаваныя Марыяй Сцяпанаўнай нацыянальна свядомымі (а гэта таксама адзначыла Тамара Карняйчук у нашай гутарцы), яе вучні сустрэлі акцыю размяшчэння ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры "прэзідэнцкай сімволікі" з варожасцю. І калі адміністрацыя школы па-над класнай дошкай прымацавала герб "з каласкамі", выраблены з гіпсу, вучні гэты герб таемна, як падпольшчыкі часоў грамадзянскай або Другой сусветнай, ушчэнт разбілі. Пасля гэтага дырэкцыя школы зноў зрабіла свой ход: над дошкай прымацавала "новы" герб, праўда, ужо ў папяровым выкананні. На гэты раз дзеці яго не зрывалі. Яны проста побач з ім размясцілі намаляваную на паперы "Пагоню". Але і "Пагоню" нехта садраў. Хто? Дырэктар?

Прапаную ўвазе чытачоў дыктафонны запіс нашай гаворкі з Уладзімірам Каштальянам (4.04.1996г., г. Салігорск)

--Пакуль юрыдычна і афіцыйна не адменена "старая" сімволіка, ці можа яна знаходзіцца побач з новай сімволікай? У тым ліку ў кабінеце беларускай мовы і літаратуры СШ № 11?

--Я скажу вам вось што: ёсць Указ Прэзідэнта, і я, дзяржаўнай школы кіраўнік, буду выконваць Указ Прэзідэнта. Усё. Новая сімволіка, сказана, каб была, я і павінен прасачыць, каб ва ўсіх кабінетах гэта сімволіка была. Новага ўзору, а не старога. Пакуль я тут дырэктар... А 205-ы кабінет падпадае пад Указ. Быў бы гэты кабінет музеем – там была б сімволіка гістарычная і дагістарычная. А так у гэтым вучэбным кабінеце павінна быць новая сімволіка. Усё.

--Гэта не азначае, што старая сімволіка павінна адтуль знікнуць?

--Гэта азначае адно, што там павінна быць адна сімволіка – новага ўзору.

ЯКІМІ БУДУЦЬ ДЗЕЦІ?

Чаму ж дзеці так упарта супраціўляюцца?

Пытацца пра тое ў іх саміх было б нетактоўна, бо вучні сваю вайну супраць прэзідэнцкай сімволікі вядуць таемна, і размаўляць з журналістам на гэтую тэму для іх значыць – парушыць канспірацыю.

І ўсё ж адказ я знайшоў.

У іхніх вершах. Напісаных няўмела, але шчыра. Іх я знайшоў на старонках падшыўкі газеты "Рагнеда".

Мяркую, чытач паставіцца да першых літаратурных вопытаў вучняў 7-х класаў СШ № 11 менавіта як да сведчанняў пра той настрой, з якім дзеці не пускаюць ні ў душу, ні ў свой "кабінет № 205" "герб з каласкамі". Вось некаторыя вытрымкі.

Вольга Цуба:

Маё роднае слова –
Беларуская мова,
Ты за ўсё прыгажэйшае,
Для мяне даражэйшае.
Наша мова не пойдзе,
Яна вернецца к нам –
І не будзе двухмоўя
У краіне сялян...

Жэня Змачынскі:

...Ды і мова
наша родная
Пахвалы,
пашаны годная.
Я люблю яе, шаную,
Як люблю
сваю матулю...

Вольга Шклярэвіч

...Родная мова –
як сонечны дзень,
Як з чыстага срэбра
крыніца...

Андрэй Кардаш:

...Можаш справу мець
З кім хочаш,
Але беларусам будзь!..

Ці добра гэта, калі дзеці любяць сваю Радзіму, сваю мову, свой сцяг і герб?

Несумненна, добра.

Ці дрэнна, калі яны супраціўляюцца новай сімволіцы, супраціўляюцца гвалту над роднай мовай?

Над гэтым пытаннем трэба падумаць. Адно зразумела, Марыя Мацюкевіч не вінаватая, што за чатыры гады выхавала з дзяцей патрыётаў. Урэшце, такі падыход да справы педагога ў той час заахвочваўся самой дзяржавай. Кожная краіна выхоўвае з дзяцей грамадзян, якія любяць яе, краіну.

Але вось змянілася палітычная сітуацыя. І цяпер Марыя Мацюкевіч апынулася невядома дзе са сваёй педагогікай. А дзяцей ужо не зменіш, не зменіш іх погляд на нацыянальныя святыні.

Чаму ж такое адбываецца з намі, дарослымі, і з нашымі дзецьмі? Таму, што найперш няма ясна акрэсленай канцэпцыі беларускага патрыятызму. Так гавораць многія грамадскія дзеячы, навукоўцы і пісьменнікі. Хутчэй за ўсё яны маюць рацыю. Іначай мы, у залежнасці ад палітычнай кан'юнктуры, ніколі не раздзелім разуменні патрыятызму і нацыяналізму, шавінізму і талерантнасці. А ў пройгрышы зноў застануцца дзеці.

ГІСТОРЫЮ – НЕ ЗНІШЧЫЦЬ

Як жа выйсці з "ціхай" грамадзянскай вайны, якая не спыняецца ў СШ № 11 г. Салігорска?

*З гэтым пытаннем я звярнуўся да дэпутата Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь, правазнаўцы **Аляксандра ДАБРАВОЛЬСКАГА.***

Вось што ён напісаў уласнай рукой у сваім адказе аўтару:

"Гаворачы пра дадзены выпадак і дадзеную гісторыю супрацьстаяння ў СШ № 11 г. Салігорска, я, напрыклад, лічу, што юрыдычныя пытанні тут не самыя важныя. Яны, сапраўды, яшчэ канчаткова не вырашаныя. Вярхоўны Савет толькі збіраецца разглядаць пытанне аб зацвярджэнні вынікаў рэферэндуму.

Галоўнае тут у іншым. Нават калі ВС зацвердзіць гэтыя вынікі, то былая сімволіка – герб "Пагоня", бел-чырвона-белы сцяг – не будзе знішчана і забаронена.

Нават калі на сумна вядомым рэферэндуме перамагла большасць, павінна быць захавана павага да меншасці -- яе духоўных каштоўнасцяў і светапогляду. Гэта будзе прыкметай цывілізаванасці грамадства. Жаданне знішчыць меншасць – прыкмета варварства. Яно вядзе да канфрантацыі ў грамадстве. Дадам, што ў такім разе прайграюць і большасць, і грамадства, і дзяржава. Прайграюць усе.

Паколькі былую сімволіку ніхто не можа забараніць, яна ўжо ўвайшла ў гісторыю дзяржавы, то герб "Пагоня" і бел-чырвона-белы сцяг могуць быць размешчаны ў гістарычных куточках школьных кабінетаў нашай краіны разам з іншымі гістарычнымі сімваламі Беларусі. Так што гэткі куток можна абсталяваць і ў кабінеце, якім загадвае Марыя Мацюкевіч. Ну і, зразумела, калі настаўнік тлумачыць вучням пра гістарычныя ўмовы з'яўлення таго ці іншага верша, напісанага Янкам Купалам, калі наогул тлумачыцца гісторыя нашай дзяржавы, ён можа скарыстаць і бел-чырвона-белы сцяг, і "Пагоню", і сцягі ды гербы СССР і БССР, і сцягі ды гербы нашых саюзнікаў або ворагаў. Гэта – веды. А яны па-за палітыкай.

У той жа самы час у класных пакоях можа знаходзіцца і новая сімволіка, прынятая згаданым рэферэндумам.

Тым не менш, выпадак у Салігорску лішні раз паказвае, што гэты рэферэндум раскалоў наша грамадства. У ва што такі раскол можа выліцца? Пытанне пакуль адкрытае.

Калі мы жывем у адной дзяржаве, калі мы ёй зычым дабра і росквіту, у нас павінна хапіць розуму паважаць погляды іншых людзей. Толькі ў такім разе мы можам разлічваць, што будуць паважацца і нашы погляды."

ЦІ ЗНОЙДУЦЬ АГУЛЬНУЮ МОВУ ДЫРЭКТАР СШ № 11, НАСТАЎНІЦА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРЫ ГЭТАЙ ШКОЛЫ, ІХНІЯ ВУЧНІ, ЯКІМ ЯНЫ АБОДВА ЗЫЧУЦЬ ДАБРА, ВЕДАЎ, ЛЮБОВІ ДА ЎЛАСНАГА НАРОДА І РОДНАЙ ЗЯМЛІ?

ЦІ ПАГОДЗЯЦЦА З МАГЧЫМЫМ ПРЫМІРЭННЕМ У. КАШТАЛЬЯН І М. МАЦЮКЕВІЧ ДЗЕЦІ?

Я НЕ ВЕДАЮ, ШТО АДКАЗАЦЬ НА ГЭТЫЯ ПЫТАННІ. Я ПРОСТА БАЮСЯ, ШТО ВУЧНІ МІЖВОЛІ ПЕРАСТУПЯЦЬ ТУЮ МЯЖУ, ЯКАЯ ІСНУЕ МІЖ ПАТРЫЯТЫЧНЫМІ ПАЧУЦЦЯМІ І ПАЛІТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦЮ. НЕ ХАЦЕЛАСЯ Б ПАЗБАЎЛЯЦЬ ДЗЯЦЕЙ ДЗЯЦІНСТВА. АЛЕ ЦІ АДГАРОДЗІШСЯ АД ЧАСУ, КАЛІ ЎЖО ТЫ АСЭНСАВАЎ БЕЛЫ СВЕТ, СВАЮ БАЦЬКАЎШЧЫНУ І СВАЁ МЕСЦА Ў ГРАМАДСТВЕ?

МОНОЛОГ О ТОМ,

КАК ЛЕГКО СТАТЬ ЗЕМЛЕЙ

Светлана АЛЕКСИЕВИЧ

из новой книги

КОГДА-НИБУДЬ ЭТИ ГОДЫ, НАШИ ГОДЫ, ЧЕРНОБЫЛЬСКИЕ ГОДЫ, СТАНУТ МИФОЛОГИЧЕСКИМИ. НОВЫЕ ПОКОЛЕНИЯ, ОДНО ЗА ДРУГИМ, БУДУТ ОБОРАЧИВАТЬСЯ НАЗАД, К НАМ: КАК ЭТО СЛУЧИЛОСЬ, ЧТО ЗА ЛЮДИ ТОГДА ЖИЛИ, ЧТО ОНИ ЧУВСТВОВАЛИ, КАК ДУМАЛИ ОБ ЭТОМ, ЧТО РАССКАЗЫВАЛИ И ЗАПОМИНАЛИ?

« Я родом из Курска. В шестьдесят девятом году у нас построили атомную станцию. В городе Курчатове. Из Курска туда ездили за продуктами. За колбасой. Атомщиков обеспечивали по высшей категории. Я запомнил там большой пруд, в нем удили рыбу. Недалеко от реактора. После Чернобыля я это часто вспоминал...

Значит, так: мне вручают повестку, и я, как человек дисциплинированный, в тот же день являюсь в военкомат. Военком листает мое "дело": "Ты, -- говорит, -- ни разу у нас на сборах не был. А тут химики нужны. Не хочешь в лагерь под Минск на двадцать пять дней?" Я подумал: "Почему бы мне не отдохнуть от семьи, от работы? Помарширую по свежему воздуху". Двадцать второго июня тысяча девятьсот восемьдесят шестого года с вещами, котелком и зубной щеткой в одиннадцать часов я прибыл на сборный пункт. Удивило то, что нас было слишком много для мирного времени. И день-то какой выпал: двадцать второе июня... Начало войны... То объявят строиться, то разойтись, и так до вечера. В автобусы погрузились, когда начало темнеть. Команда: "Кто спиртное взял, выпивайте. Утром будем в части. Чтобы вышли свежие, как огурчики, и без лишнего багажа." Гудели всю ночь.

Утром нашли в лесу свою часть. Снова построили и вызывают по алфавиту. Получение спецодежды. Дали один комплект, второй, третий, ну, думаю, серьезные дела. Еще выдают шинель, шапку, матрац, подушку -- все зимнее. А на улице – лето, и обещали, что отпустят через двадцать пять дней. "Да вы что, ребята, -- смеется капитан, который нас вез, -- какой месяц? Двадцать пять дней? На полгода в Чернобыль загремите". Недоумение. Агрессия. Тут нас давай уговаривать, соблазнять: кто за двадцать километров попадет – двойной оклад, кто за десять – тройной, кто к самому реактору – множь на шесть. Один начинает считать, что он за шесть месяцев на своей машине домой приедет, другой хотел бы убежать, но военная дисциплина. Военный приказ. Что такое радиация? Никто не слышал. А я как раз перед этим прошел курсы по гражданской обороне, нам выдавали информацию тридцатилетней давности: пятьдесят рентген – смертельная доза. Учили, как падать, чтобы ударная волна над тобой прошла, не задела. Облучение, тепловой нагрев... А о том, что радиоактивное заражение местности – самый поражающий фактор, ни слова. И те кадровые офицеры, которые везли нас в Чернобыль, не больно соображали: водки надо побольше, от радиации помогает. Шесть дней стояли под Минском, шесть дней пили.

Значит, так: я – инженер-химик, кандидат наук, призвали меня с должности заведующего лабораторией крупного производственного объединения. Как меня использовали? Мне дали в руки лопату, практически это был мой единственный инструмент. Тут же родился афоризм: на атом с лопатой. Защитные средства: респираторы, противогазы, но никто ими не пользовался, потому что жара, до тридцати градусов, напялишь – умрешь сразу. Расписались как за дополнительную амуницию – и забыли.

Как мы туда ехали. Когда из автобусов пересели в поезд, посадочных мест в вагоне – сорок пять, а нас – семьдесят человек. Спали по очереди. Что такое -- Чернобыль? Боевая техника и солдаты. Зеленые палатки. Моечные посты. Военная обстановка. Разместили в палатках, по десять человек. У кого-то остались дома дети, у кого-то жена рожает, у кого-то нет квартиры. Никто не ныл. Надо, значит, надо. Родина призвала, родина велела. Такой у нас народ.

Вокруг палаток гигантские горы пустых консервных банок. Где-то хранившийся на военных складах неприкосновенный запас. Банки из-под тушенки, перловой каши, масла, кильки... Стаи кошек... Их, как мух... Деревни выселены... От ветра калитка скрипнет, мгновенно оборачиваешься: ждешь человека. Вместо человека – кошка входит...

Снимали зараженный верхний слой земли, грузили в автомашины и вывозили в могильники. Я считал, что могильник – какое-то сложное инженерное сооружение, а это обычный курган. Землю мы поднимали и сворачивали большими рулонами... Как ковер... Зеленый дерн с травой, цветами, корнями... С жучками... Пауками, червяками... Работа для сумасшедших... Нельзя же ободрать всю землю, снять с нее все живое. Если бы не пили по-черному, каждую ночь, сомневаюсь, что можно выдержать. Психика не устояла бы. Сотни километров ободранной земли, бесплодной. Дома, сараи, деревья, шоссейные дороги, детские садики, колодцы -- оставались, как голые... Среди песка и глины... Утром надо побриться, боишься заглянуть в зеркало, увидеть свое лицо. Потому что мысли появлялись всякие... Ненормальные... Трудно представить, чтобы туда вернулись жить люди... Но мы меняли шифер, мыли крыши. То, что делаем бесполезную работу, понимали все. Тысячи людей. Но каждое утро вставали и снова ее делали. Неграмотный дед встретит: "Кидайте, сынки, дурную работу. Садитесь за стол. Пообедайте с нами". Ветер дует... Тучи плывут... Реактор не закрыт... Сняли слой, через неделю вернулись, можно наново начинать. А снимать уже нечего. Песок сыплется... Смысл мелькнул один раз, когда с вертолетов разбрызгивали специальный раствор, чтобы получилась полимерная пленочка, не позволяющая легкоподвижному грунту перемещаться. Разноситься. Это мне было понятно. Но мы копали, копали...

Деревни выселены, но в некоторых оставались старики... Зайти в обычную хату и сесть пообедать... Сам ритуал... Полчаса нормальной человеческой жизни... Хотя есть там ничего нельзя. Нам запрещалось. Но так хотелось посидеть за столом... В хате...

После нас оставались могильники. Курганы. Потом их должны были обкладывать бетонными плитами, огородить колючей проволокой. Оставляли самосвалы, уазики, краны, на которых работали. Металл имеет свойство радиацию поглощать, накапливать. Все это потом куда-то исчезло. Разворовали.

Один раз – тревога: дозиметристы проверили, и оказалось, что наша столовая построена на месте, где радиация выше, чем там, куда мы ездили работать. А мы жили тут два месяца.

Через два месяца мы уже начали что-то понимать. Давай спрашивать: "Мы же не смертники. Побыли два месяца, хватит. Пора нас поменять". Как сейчас помню, генерал-майор проводил с нами беседу, откровенничал: "Нам невыгодно вас менять. Мы вам дали один комплект одежды. Второй, третий. Вы навыки приобрели. Менять вас – дорогое дело, хлопотное". И упор на то, что мы – герои. Родина не забудет. Раз в неделю тем, кто отличился, кто хорошо землю копал, перед строем вручали похвальную грамоту.

Пустые деревни. Куры и кошки. Зайдешь в сарай, полно яиц. Жарили. Солдаты – бравые ребята. Курицу словят. Костер. Самогон. Каждый день в палатке выпивали хором трехлитровую банку самогона. Кто-то в шахматы играет, кто-то на гитаре. Человек ко всему привыкает. Один напьется – и в кровать, другому кричать охота. Драться. Двое сели пьяные за руль. Разбились. Автогеном их вырезали, доставали из расплющенного железа. Я спасался тем, что писал домой длинные письма и вел дневник. Засек меня начальник политотдела, стал за мной охотиться: где тетрадку храню, что пишу? Подговорил соседа шпионить за мной. Тот меня предупредил: "Что строчишь?" – "Кандидатскую защитил. Докторскую пишу." Смеется: "Я так полковнику и передам. А ты это дело спрячь." Хорошие были ребята. Ни одного нытика. Труса. Поверьте мне: нас никто никогда не победит. Никогда! Офицеры не вылазили из палаток. Валялись в домашних тапочках. Пили. Плевать! Мы копали. Пусть получают на погоны новые звездочки. Плевать! Такой у нас народ.

Дозиметристы – боги. Все местные к ним проталкиваются: "Ну, сынок, какая у меня радиация?" Зовут во двор, в хату. Один предприимчивый солдат сообразил: взял обыкновенную палку, намотал на нее проволоку и пошел по деревне. Постучался в одну хату и по стене этой палкой водит. Бабка за ним: "Сынок, что там у меня?" "Военная тайна, бабка". – "А ты мне скажи, сынок. Я тебе стакан самогонки налью". – "Ну, давай!" Выпил. "Все нормально у тебя, бабка". И пошел дальше...

В середине срока нам всем выдали дозиметры. Некоторые стали соображать: надо его утром отвезти к могильнику и оставить, а к концу дня забрать. Чем больше радиации, тем скорее отпустят дадут. Домой отпустят либо больше заплатят. Кто на сапог, там лямочка есть, повесил, чтобы ближе к земле... Но эти датчики были не заряжены. Для того, чтобы они начали отсчет, их надо было зарядить первичной дозой радиации. Эти финтифлюшки нам дали для отвода глаз. Психотерапия. Какое-то допотопное устройство, на складах лет пятьдесят валялось.

В военный билет в конце каждому вписали одинаковую цифру: среднюю дозу радиации умножили на число дней пребывания. Замерили среднюю дозу в палатках, где мы жили. *(Делает длинную паузу.)* Но ничего не забывается...

Два часа – на отдых. Ляжешь под кустик, а созрела уже вишня, такая крупная, сладкая, обботрешь – и в рот. Шелковица, я первый раз видел шелковицу...

Когда работы не было, водили на строевую. Фильмы смотрели. Индийские. Про любовь. До трех--четырех часов утра. Кашевар проспит, каша сырая. Привозили газеты. Там писали, что мы – герои! Добровольцы. Печатались фотографии. Встретить бы нам того фотографа... Такую мать! Длинная траншея в чистом поле, и больше ничего. Ни одной будки... И рядом реактор... Такой мы народ.

Рядом стояли интернациональные части. Татары из Казани. Видел их самосуд. Гонят перед строем солдата, остановится или отбежит в сторону – бьют. Бьют ногами. За что? Лазил по хатам,чистил. Сумку барахла нашли. Были еще литовцы. Через месяц взбунтовались и потребовали, чтобы отправили домой.

Был однажды спецзаказ: срочно помыть дом в пустой деревне. "Зачем?" Фантастический ответ: "Завтра там будут играть свадьбу". Облили из шлангов крышу, деревья, соскребли землю... Скосили картофельную ботву, огород, траву во дворе. Пустырь вокруг. Назавтра привезли жениха и невесту... Приехал автобус с гостями... Музыкой... Это были настоящие жених и невеста. Они уже жили в другом месте, переселились, но их уговорили приехать сюда, чтобы заснять для истории. Для кино. Работала пропаганда. В этом ужасе она защищала наши мифы: мы везде выживем, даже на мертвой земле...

Перед отъездом меня вызвал командир: "Что ты писал?" – "Письма молодой жене", -- ответил я. "Ты там смотри!.."

Что осталось в памяти? Как мы копали, копали... В дневнике у меня записано, что я там понял. В первые же дни. Я понял, как легко стать землей... »

Иван Николаевич ЖМЫХОВ, инженер-химик



ІНФАРМУЕ

БЕЛАРУСКІ ПЭН-ЦЭНТР

Міжнародны ПЭН-клуб заснаваны ў 1921 годзе вядомым ангельскім пісьменнікам, лордам Джонам Галсуорсі з мэтаю абароны пісьменнікаў і журналістаў ад пераследу ў выніку іхняй прафесійнай дзейнасці, ад замахаў на свабоду творчасці альбо на свабоду слова і друку, правоў чалавека, а таксама дзеля міжнароднага гуманітарнага супрацоўніцтва.

ПЭН - гэта Паэзія, Эсэістыка і Навелістыка (гэтак на захадзе вызначаюць прозу), але лацінскія літары PEN разам складаюць слова, якое перакладаецца як пяро, адзіны інструмент пісьменніцкай альбо журналісцкай творчасці (клавішы кампутара – хіба што асучасненае пяро). Адтуль і сімволіка Міжнароднага ПЭН-клубу: высакародная шпага, прызнак пачэснай абароны, і старажытнае пяро, якое трымалі асобы, што ўвайшлі ў гісторыю сусветнае літаратуры.

Структурна Міжнародны ПЭН-клуб мае штаб-кватэру ў Лондане, дзе ён быў створаны, і 126 нацыянальных ПЭН-цэнтраў у розных краінах свету, дзе стала развіваецца літаратура і ўзнікла нацыянальная літаратурная эліта, якая ў значнай ступені адказная як за лёс гожага пісьменства, так і за маральна-філасофскую глебу грамадскай думкі, нават калі з экстралітаратурных, перш за ўсё палітычных прычынаў гэтая глеба ігнаруецца.

ХАРТЫЯ МІЖНАРОДНАГА ПЭН-КЛУБА

Літаратура – з'ява нацыянальная па паходжанні, але яна не ведае дзяржаўных межаў і павінна заставацца сродкам зносін паміж народамі нягледзячы на праблемы нацыянальнага і міжнароднага характару. Пры складаных міжнародных акалічнасцях і асабліва ў час вайны нацыянальныя або палітычныя імкненні не павінны ўздзейнічаць на творы мастацтва, на шкоду справе абароны гуманізму.

Сябры ПЭН-клубу абавязаныя заўсёды карыстацца сваім аўтарытэтам у грамадстве дзеля ўмацавання ўзаемапаразумення і павагі паміж народамі, а таксама ўсімі сіламі процідзейнічаць класавай і нацыянальнай варожасці, асабіста супрацьстаяць усім відам знявагі і дыскрымінацыі па расавых ці нацыянальных адзнаках, абараняць агульначалавечыя ідэалы, ідэалы міру і згоды ў свеце.

ПЭН-клуб выступае ў абарону прынцыпаў свабоды інфармацыі ў кожнай краіне і паміж усімі краінамі свету, ягоныя сябры абавязваюцца выступаць супраць падаўлення свабоды слова ў любой яе форме ў той краіне і ў тым грамадстве, да якіх яны належаць, а таксама – калі гэта магчыма – ва ўсім свеце.

ПЭН-клуб выступае ў абарону свабоды друку і супроць увядзення цэнзуры ў мірны час.

ПЭН-клуб лічыць, што рух чалавецтва да больш высокіх формаў палітычнай і эканамічнай арганізацыі вымагае свабоднай крытыкі ўрадаў, органаў кіраўніцтва і палітычных інстытутаў. З тае прычыны, што свабода забяспечваецца добраахвотнай адказнасцю за свае ўчынкі, сябры ПЭН-клубу абавязваюцца выступаць супроць такіх негатыўных аспектаў свабоднага друку, як ілжывасць у публікацыях, наўмысная фальсіфікацыя, скажэнне фактаў або тэндэнцыйная і несумленная іх інтэрпрэтацыя дзеля палітычных, групавых і асабістых мэтаў.

Былы Дом кіно, а сёння касцёл Сымона і Алены, вядомы як чырвоны касцёл, сведка: там у 1989 годзе сабралася інтэлігенцыя на ўстаноўчы сход, які заснаваў Беларускі ПЭН-цэнтр. Крыху пазней з'явіліся Пастанова Савета Міністраў № 274 ад 1 лістапада 1990г. "Аб дзейнасці Беларускага ПЭН-цэнтру на тэрыторыі рэспублікі" і Рэгістрацыйнае пасведчанне Міністэрства юстыцыі БССР № 0123 ад 16 лістапада 1990г.

Беларускі ПЭН-цэнтр прыняты ў вялікую сям'ю Міжнароднага ПЭН-клубу на 55 Кангрэсе (востраў Мадэйра, травень 1990г.). Беларускія літаратурныя і грамадскія дзеячы былі гэтак ўганараваныя ўпершыню, яны прымалі звыклыя ў дэмакратычным грамадстве, але ненатуральныя пры суцэльнай савецкасці абавязкі маральнай, юрыдычнай і іншай абароны пісьменнікаў і журналістаў.

Першым прэзідэнтам Беларускага ПЭН-цэнтру (1990-1994г.) быў абраны паэт Рыгор Барадулін. Першай буйной акцыяй Беларускага ПЭН-цэнтру сталася палымяная ды дакладна абгрунтаваная прамова Рыгора Барадуліна на Сусветнай Асамблеі Міжнароднага ПЭН-клубу ў Парыжы аб замоўчванні праўды пра Чарнобыльскую трагедыю і яе наступствы. Прамова Рыгора Іванавіча адбылася ў дзень пятых угодкаў выбуху, які і дасюль пагражае нам і Еўропе як справакаваная ўсёй наскай сістэмай катастрофа, якая здольна распаўзацца па кантыненце нябачна, павольна, каб ніхто не здагадаўся аб тым, што грамадства чакае. Тады мо ў першыню адчулі трывогу ад барадулінскіх слоў пісьменнікі свету. Неафіцыйная, няўрадавая Беларусь была пачутая і ўспрынятая інтэлектам свету насуперак заангажаваным імкненням МАГАТЭ. Удзельнікі Асамблеі слухалі паэта неяк узрушана, нарэшце ўсвядомілі смяротную пагрозу, якую нікому не дадзена адвесці.

Гэта быў пачатак дзейнасці, пачатак шляху, па якім ПЭН-цэнтр і дасюль ідзе. У 1995 годзе ягоным прэзідэнтам абраны Васіль Быкаў.

***

Беларускі ПЭН-цэнтр арганізаваў і правёў два міжнародныя кангрэсы ў абарону дэмакратыі і культуры, якія сталіся падзеямі ў інтэлектуальным жыцці Беларусі. Тэма I Кангрэсу, які адбыўся ў траўні 1994 года, -- "Посттаталітарнае грамадства: асоба і нацыя". Сорак чатыры замежныя і айчынныя прамоўцы ахапілі пытанне ўсебакова, прынялі шэраг важкіх дакументаў, сярод якіх і пастанову аб заснаванні штогадовай літаратурнай прэміі імя Алеся Адамовіча ў галіне публіцыстыкі па чатырох намінацыях.

Нельга не ўлічыць і забыты ў бязладдзі апошніх гадоў чалавечы фактар: слынныя пісьменнікі еўрапейскага маштабу з розных краінаў былой імперыі і далёкага замежжа, сябры і паплечнікі сустрэліся ў Доме творчасці пісьменнікаў "Іслач", пажылі колькі дзён пад адным дахам, падзяліліся думкамі, слухалі адзін аднаго, разам глядзелі беларускія фільмы "Летапісу" ды выдатную фотавыставу Яўгена Коктыша, прысвечаную Алесю Адамовічу. Неўзабаве пабачыў свет зборнік матэрыялаў і дакументаў, сведчанне патэнцыялу і вартасці агульнай працы.

II Міжнародны кангрэс (жнівень – верасень 1995г.) абмеркаваў тэму: "Незалежная прэса: свабода і адказнасць". Каля шасцідзесяці выступоўцаў адлюстроўвалі становішча ў Беларусі ды іншых краінах, даводзілі ўласныя думкі ды выпрацоўвалі дакументы. На гэты раз фотавыставу на тэму кангрэсу падрыхтаваў Сяргей Грыц.

3 верасня, у дзень нараджэння Алеся Адамовіча, прайшло ўрачыстае ганараванне першых лаўрэатаў літаратурнай прэміі, якая носіць яго імя. Імі сталі: Анатоль Казловіч -- за літаратурна-публіцыстычнае ўвасабленне беларускай нацыянальнай ідэі ў серыі прытчаў "Беларусы паміж небам і зямлёй"; Самсон Палякоў і Анатоль Алай – за высокамастацкае кіноўвасабленне гуманістычнай ідэі, звязанай з Другой Сусветнай вайной, у дакументальным фільме "Чорны шлях"; Павел Шарамет – за высокую прынцыповасць тэлекаментарыяў на ўнутрыпалітычныя тэмы ў цыкле тэлепраграмаў "Праспект"; Віталь Цыганкоў -- за журналісцкую дзейнасць на старонках газеты "Свабода"; Валянцін Жданко – за серыю выступленняў у газеце "Звязда", звязаных з аналізам палітыка-эканамічнага становішча ў Беларусі.

А на наступны дзень удзельнікі кангрэсу ездзілі ў Глушу, дзе адбылося адкрыццё помніка незабыўнаму Алесю.

Сёння, дзякуючы зладжанай працы Выдавецкай кампаніі "Тэхналогія", мы маем салідны том II Кангрэсу на беларускай і ангельскай мовах.

25 сакавіка гэтага года, у Дзень Волі, адбылося ганараванне новай штогадовай літаратурнай прэміяй Беларускага ПЭН-цэнтру -- імя Францішка Багушэвіча. Першымі лаўрэатамі сталі Кастусь Акула, Уладзімір Арлоў і Генадзь Сагановіч (гл. "Круг", № 1).

***

Беларускі ПЭН-цэнтр удзельнічае ў праграме па стварэнні "Усеагульнай Дэкларацыі лінгвістычных правоў". Галаўной установай па выпрацоўцы дакумента з'яўляецца Камітэт па мастацкім перакладзе і лінгвістычным праве Міжнароднага ПЭН-клубу з базай у Барселоне. Усеагульная Дэкларацыя задумана як акт міжнароднага права, які будзе падпісаны ўсімі ПЭН-цэнтрамі свету на заключнай асамблеі ПЭН-клубу ў Барселоне (чэрвень 1996г.). Потым дакумент будзе перададзены ў ААН для разгляду і прыняцця.

З гэтай нагоды Беларускі ПЭН-цэнтр стварыў камісію, у працы якой бяруць чынны ўдзел вядомыя філолагі, лінгвісты, псіхолагі, пісьменнікі з ліку сяброў Беларускага ПЭН-цэнтру і ягоных прыхільнікаў. Камісія мае мэту разгледзець, ці сапраўды Дэкларацыя універсальна, ці ахоплівае моўныя праблемы постімперскіх краінаў накшталт Беларусі, ці паспрыяе Дэкларацыя гуманным мэтам гарманізацыі адносінаў паміж народамі і іхнімі культурамі.

Дзякуючы ўліку разнастайных заўвагаў і працягламу тэрміну абмеркавання, адзінаццаты варыянт папярэдняга праекту Дэкларацыі стасуецца, бадай, да большасці сітуацыяў, здольных прыводзіць да моўнае дыскрымінацыі. І ўсё ж нашая, беларуская лінгвістычная сітуацыя, пры ўсёй яе спецыфічнасці, мае пэўныя тыпалагічныя рысы, якія могуць у большай ці меншай ступені выяўляцца ў іншых краінах. Стасуючы праект Дэкларацыі да беларускага становішча, калі пад пагрозаю знаходзіцца этнічная мова дзяржаваўтваральнага народу, камісія заўважыла, што рэсурсаў праекту недастаткова – як для апісання такога становішча, так і для яго выпраўлення.

Цяпер Камітэт Міжнароднага ПЭН-клубу вывучае нашыя матэрыялы як па гісторыі пытання, так і па канкрэтных прапановах удасканалення праекту, вядзе кансультацыі з нашай камісіяй ды рыхтуе Асамблею. З нядаўняе пары Беларускі ПЭН-цэнтр таксама ўваходзіць у лік распрацоўшчыкаў Усеагульнай Дэкларацыі правоў праваабаронцаў па просьбе Асацыяцыі юрыстаў ЗША. Выконваючы Пастанову II Кангрэсу, сябры Беларускага ПЭН-цэнтру разам з вядомымі грамадскімі дзеячамі і навукоўцамі рэспублікі ініцыіравалі стварэнне Беларускага Хельсінкскага Камітэту, які ўжо разгарнуў сваю дзейнасць па дзесяці напрамках абароны правоў чалавека. ПЭН-цэнтр і Хельсінкскі Камітэт заснавалі штомесячнік "Круг", які вы, дзякаваць Богу, трымаеце ў руках.

***

Юрыдычная служба Беларускага ПЭН-цэнтру распаўсюджвае прававыя веды, вядзе маніторынг парушэнняў свабоды слова і друку, пераследу пісьменнікаў і журналістаў, займаецца праблемамі ўдасканалення заканадаўства аб сродках масавай інфармацыі, кансультуе пісьменнікаў і журналістаў па гэтых пытаннях. Маніторынг вядзецца ўсімі ПЭН-цэнтрамі свету, яны накіроўваюць матэрыялы ў спецыяльны камітэт Міжнароднага ПЭН-клубу, які выбірае адэкватныя меры міжнароднай абароны і падтрымкі асобы.

Юрыдычная служба выдае штоквартальны бюлетэнь "Журналістыка і права" (Заканадаўства і практыка СМІ на Беларусі). Бюлетэнь досыць папулярны, хоць пабачыў свет толькі другі нумар. Наклад разыходзіцца імгненна. Юрыдычная служба падрыхтавала прававы дапаможнік для студэнтаў журфаку і мае намер выдаваць вынікі маніторынгу штогод з абагульняючымі каментарамі спецыялістаў. Магчыма, неўзабаве Юрыдычная служба пашырыць свае функцыі і будзе кансультаваць пісьменнікаў і журналістаў, ахопліваючы большае кола тэмаў, і бясплатна. Беларускі ПЭН-цэнтр спадзяецца, што ягоная Юрыдычная служба прынясе карысць грамадству, дапаможа прадстаўнікам так званай чацвёртай улады дзейнічаць эфектыўна ў межах закона, карэктна і высакародна, з павагаю да сябе, да аб'ектаў інфармацыі і даследавання, і, безумоўна, да шаноўнага чытача, нягледзячы на ягоныя погляды.

Вось кола клопатаў Беларускага ПЭН-цэнтру ў самым сціслым выглядзе. Зараз ідзе праца над новымі праектамі і грамадскімі ініцыятывамі, сярод якіх працяг серыі творчых вечарынаў "Як на споведзь", выданне літаратурнага часопіса, зборніка публіцыстыкі і шмат іншае. Магчыма, у верасні адбудзецца міжнародная канферэнцыя, на якой сустрэнуцца кіраўнікі ПЭН-цэнтраў, што працуюць у краінах былой імперыі і Усходняй Еўропы. Гэта будзе спроба вызначыць становішча і метады супрацоўніцтва.

НЯДАЎНА БЕЛАРУСКІ ПЭН-ЦЭНТР МЕЎ ГОНАР ПРЭЗЭНТАВАЦЬ НОВУЮ КНІГУ РЫГОРА БАРАДУЛІНА "ЗДУБАВЕЦЫЦЯ". ЯНА "СТАІЦЬ" НА ПАДМУРКУ НАРОДНАГА ГУМАРУ, ЯК І МНОГІЯ РАНЕЙШЫЯ ТВОРЫ ПАЭТА. ВЫПУСЦІЛА КНІГУ ВЫДАВЕЦТВА ТАА "ПАЛІФАКТ". ГАЗЕТА "КРУГ" ПРАПАНУЕ РАЗДЗЕЛ З ГЭТАЙ КНІГІ СВАІМ ЧЫТАЧАМ, А ТЫМ З ІХ, ХТО ЛІЧЫЦЬ СЯБЕ ПУРЫТАНІНАМ, РАІЦЬ ПЕРШ ПАЧЫТАЦЬ ПРАДМОВУ АЎТАРА. "К" ЗАХОЎВАЕ АЎТАРСКІ ПРАВАПІС.

Рыгор БАРАДУЛІН

КАБ РОД НЕ ЗВЁЎСЯ

ВУШАЦКІЯ ПЕСЬНІ, ПАПЕЎКІ, ЯК І ЎСЯ НАРОДНАЯ ПАЭЗІЯ НАОГУЛ, УЖЫВАЮЦЬ СКАРОМНЫЯ СЛОВЫ Й ВОБРАЗЫ. У ВУСНАХ НАРОДНАЙ ПЕСЬНІ, АБРАДАВАЙ ЦІ ПОБЫТАВАЙ, ЛЮБОЕ СЛОВА ГУЧЫЦЬ ЦНАТЛІВА, БО ГЭТА ЙДЗЕ ЯШЧЭ АД ПАГАНСТВА, ЯКОЕ НЯ КАРЫСТАЛАСЯ ФІГАВЫМ ЛІСТКОМ. НАСЕЛЬНІКІ ХАЛАДНАВАТАЙ ЧАСЬЦІНЫ ПЛАНЕТЫ ГРЭЛІ СВОЙ ЮР, ЯТРЫЛІ СЯБЕ СЛОВАМ МОЦНЫМ, ЯК ПЯРШАК. КАБ РОД НЯ ЗЬВЁЎСЯ.

Аўтар



□

А дзед бабу разуваў,
Пад ножачку паглядаў:
-- Ой, бабулька, што за зьвер,
Я ж баюся, каб ня зьеў.
-- Ці ты ў лесе ня бываў,
Чорных зьвяроў ня відаў?
Ты, дзядулька, ня рабей,
Гэта птушка – салавей.
Ён і сьвішчаць і пяець,
І спакою ня даець.

□

Кум ня пьець,
Кум ня пьець, кум ня пьець,
Кума ня хочаць.
А ў кумы пад пупам
Блыха шчакочаць.
--Ты, кумок, галубок,
Ня будзь у граху,
Паганяй у кумы
Пад пупам блыху!

□

І стар, і нядуж,
І крывы на нагу,
Як убачу маладую,
Ашалеўшы бягу.

□

А на дварэ шум-гум.
--А хто едзіць?
--Кум, кум.
--А што вязець?
--Акуні.
--А для каго?
--Для кумы.

□

Ажаніўся мяшок,
Узяў торбачку,
Туды-сюды павярнуў –
Цмок у мордачку.

□

Ці ня Бог табе даў,
Мая Настачка
Усю ночку макаў,
Як у маслачка.

□

Я ся..оньня ра..а ўстала,
Да суседа я паджэгала:
--Ці ты відзіў, ці ты бачыў,
Хто мне перад рассабачыў?
--А я відзіў, а я бачыў,
А я перад рассабачыў.

□

Яшчэ сонца ня ўсхадзіла,
Курва курвачку радзіла,
А як стала залачаць,
Стала курвачка крычаць,
А як стала усхадзіць,
Стала курвачка хадзіць.

□

А старой сто гадоў,
А старому дзьвесьце.
Стары лесьвіцу майструіць
На старую ўзьлезьці.

□

Цераз рэчку йшла,
На кладачку села:
--Пі, п..дзічка, пі вадзічку,
Ты кілбаску зьела.

□

Як заручалі, тады казалі,
Што ў свата кароў многа.
Як пайшла даіць,
Адзін бык стаіць,
І той ня доіцца.
Вазьму я быську
Ды за пумпыську:
А дай, быська, малака!

□

Салавей, салавей,
Што на сьвеце саладзей,
Ці гарэлка, ці мядок,
А ці ў дзеўкі перадок?

□

Стары, стары, лезь на печ, --
Стары расстагнаўся,
Стары, стары, лезь на бабу, --
Стары расьсьмяяўся.

□

А бандалы, бандалы,
Падымаюць падалы,
А маленькі бандалок
Падымаіць падалок.

□

Ой, каліна, сьмелы цьвет,
Каля пупа сельсавет,
Пад пупом райвыканком,
Куды ходзяць за пайком.

□

Ня руш мяне, ня чапай,
Я дворная дзеўка –
Паміж лытак
Клубок ніттак,
А там і цяцерка.

□

Наелася буракоў,
Напілася квасу,
Манілася хлопцу даць,
Ні дабрала часу.

□

Чух-чух, начухаўся,
Падняў хвартух, нанюхаўся,
Падняў хвартух і спадніцу,
А там сядзіць з рукавіцу.

□

Давяла ты мяне,
Мая Зосічка, --
Ні каня, ні дугі,
Ні атосачкі.

□

Ах ты, Янячка, пабіляначка,
Дзе машок расьцець,
Там і ямачка.
Імшок разьлітаіцца,
І ваўчок раздуваіцца.

□

Ой, дзевачкі, Бог із вамі,
Зьніму штаны, лягу з вамі.
Зьніму штаны і сарочку,
Лягу з вамі на ўсю ночку.

□

Ой, сват, ты мой сват,
Ня бяры мяне за зад,
Бяры мяне за пярод,
Тады мяне забярот.

BELARUSSIAN HUMAN RIGHTS NEWSPAPER "KRUG" ("CIRCLE")

Second Issue Contents
06.1996, Minsk

Галоўны рэдактар Анатоль КАЗЛОВІЧ

ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Беларускі ПЭН-цэнтр, Беларускі Хельсінкскі Камітэт

ШТОМЕСЯЧНІК "КРУГ"

РЭДАКЦЫЙНЫ САВЕТ:
Уладзімір АРЛОЎ (ПЭН-цэнтр), Рыгор БАРАДУЛІН (ПЭН-цэнтр), Лявон БАРШЧЭЎСКІ (БХК), Генадзь БУРАЎКІН (БХК), Васіль БЫКАЎ (старшыня рэдсавета, ПЭН-цэнтр), Наталля ДОЎНАР (Юрыдычная служба ПЭН-цэнтра), Анатоль КАЗЛОВІЧ (БХК), Тацццяна ПРОЦЬКА (БХК), Карлас ШЭРМАН (ПЭН-цэнтр)

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Мінск, вул. Кнорына, 8
тэл. 266-26-91

Тыраж 499 экз,
Падпісана ў друк: 05.06.96
Друкарня "Мэджык", Мінск, вул. В. Харужай, 13
Кошт свабодны